Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактора—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нікыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зымна нашаградзкія	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нашаградзкі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нашаградзкі насьпрад тэксту	1 р. — к.
За радок нашаградзкі перад тэкстам	1 р. 50 к.
Сьвешчныя на 50 проц. дарожэй.	
Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. пазогу.	

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дазмэнк	35 к.
За кожны дазмэнк	15 „
Беспраддзэм. і чырвонаармейцы за дазмэнк	15 „
За кожны дазмэнк	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 25 (2213) Нядзеля, 29-га студзеня 1928 г.

На хаду рацыяналізацыі вытворчасьці.

Работа па рацыяналізацыі разгортваецца шырокім фронтам. Перад кожным гаспадарнікам, рабочым, майстрам, інжынэрам і служачым пастаўлена задача: палепшыць свой вучастак працы, браць актыўны ўдзел у капітальным будаўніцтве.

Сацыялістычны характар нашай гаспадарчай дзейнасьці зьяўляецца імкненнем у тым, што, паляпшаючы нашу адсталую тэхніку, прысьпешаючы тэмп працы, мы атрымліваем ня толькі высокаякасныя і танныя вырабы, але і вызваляем сродкі, неабходныя для павышэньня зарплаты, для ўвядзеньня сямігадзіннага рабочага дню і здавоеньня іншых патрэб рабочых.

Рацыяналізацыя зрабілася рэальным фактарам, і зараз шмат гаворыць як аб яе дасягненьнях, так і аб скажэньнях і недахопах. У кожным паасобным выпадку ход рацыяналізацыі залежыць ад ступені ўяўленьня і актыўнасьці ня толькі гаспадарчых, але і прафэсыянальных арганізацый.

Мы маем выпадкі нязвычайных посьпехаў, як, напрыклад, на заводзе «Электрасіла» ў Ленінградзе, дзе ў старых карпусох ранейшага вагонабудаўнічага заводу «Артур Коппель» выраблены нармальных электрычных машын пастаўлены па прынцыпу Форда, г. зн. бесьперапыннай працай.

Ад старога заводу засталіся толькі сьцены. Над імі быў зроблен дах, пад якім былі пастаўлены варштаты па ходу вытворчага працэсу і наладжаны спэцыяльныя прылады для кожнай апэрацыі, а таксама для перадачы вырабаў з аднаго варштата на другі.

Была пароблена вялікая творчая канструктарская праца. Цэлы шэраг дасьціпных прыладаў быў уведзены для палегчаньня, прысьпешаньня і палепшаньня ходу працы.

У выніку ўвесь працэс па вырабу машын з наступаючай сыравіны і поўфабрыкатаў займае замест 20—толькі 2 тыдні, сабекошт панізіўся на 20 проц., а расцэнкі зьнізіліся на 50 пр. у той час як зарплата павысілася на 30 проц.

Завод «Электрасіла» даў справе рацыяналізацыі моцны штуршок наперад, а яго дасягненьні маюць вялікае значэньне для прамысловасьці.

На іншых заводах (Мэталёгомзы ў Маскве, «Серп і Молат» у Харкаве) мы маем гэткія вялікія дасягненьні ў гэтым напрамку, дасягненьні, якія ўрэшце вядуць да павышэньня тэхнічнага ўзроўню савецкай прамысловасьці.

Усё, што казалі аб спэцыялізацыі заводаў, аб скарачэньні асартымэнту, аб стандартызацыі, аб лепшым выкарыстаньні абсталяваньня не прайшло бясьсьледна—усё гэта ўжо пусьціла карэньні і ў некаторых мясцох дало вынікі.

Але, падагульваючы гэта, нельга ня спыніцца на недахопах і скажэньнях, якія перашкаджаюць справе рацыяналізацыі і нішчаць атрыманыя з вялікай цяжкасьцю станоўчыя вынікі.

Бюракратызм у вытворчасьці зьяўляецца яшчэ больш шкодным за бюракратызм апарату. Вельмі часта кіраўнікі прадпрыёмстваў, разумеючы партыйныя дырэктывы фармальна, стараюцца дамагчыся неадкладнага эфэкту, часамі нават па шкоду самой вытворчасьці. Мерапрыёмствы па рацыяналізацыі, калі яны праводзяцца не прадумана і не па плану, даюць часта адмоўныя вынікі. Так, калі загадзя не прапрацаваць пытаньня аб вызваляючайся рабочай сіле, рабочыя масы будуць настроены варожа да рацыяналізацыі.

Фармальныя адносіны да рацыяналізацыі адбіваюцца і ў тых выпадках, калі жадаючы паказаць сваю руплівасьць у галіне скарачэньня накладных выдаткаў, скарачаюць канструктарскае бюро, аддзел рацыяналізацыі, робяць эканомію на тэхнічнай літаратуры, на заводзкіх лябораторыях, на навучных камандыроўках, на экспэртызу і г. д.

Мы бачым, што часамі тыя самыя заводы, якія прысылаюць пераможныя данясеньні, паказваюць праз нейкі час збытак браку, вялікія страты з прычыны неадпаведнасьці заказанага абсталяваньня і будынкаў іх прызначэньню і г. д.

Мы не павінны баяцца памылак, якія нямінуча бываюць у кожнай новай справе, але не павінны супакойвацца і на атрыманых дасягненьнях.

Выпраўляючы памылкі, кіруючыся мінулым вопытам, выконваючы дырэктывы партыі, мы ідзем наперад шпаркімі крокамі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

10-я ЖАЛОБНАЯ ГАДАВІНА ДЛЯ БЭСАРАБЦАЎ.

ПАТРАБУЕМ ПЛЕБІСЦЫТУ Ў АКУПАВАНАЙ БЭСАРАБІІ.

З НАДЗЕЯЙ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ ГЛЯДЗЯЦЬ ЯНЫ НА САВЕЦКУЮ МАЛДАВІЮ.

БАЛТА, 26-га студзеня адчынілася чацьвертая сэсія ЦВК аўтаномнае Малдаўскае ССР.

Адчыняючы сэсію, старшыня ЦВК АМССР Варановіч заявіў: „Сэсія супадае з дзесятаю гадавінай акупацыі Бэсарабіі. Малдаўскі ўрад штодзень займаецца палепшаньнем дабрабыту працоўных аўтаномнае Малдаўскае ССР і разьвіцьцём культурнага і эканамічнага будаўніцтва рэспублікі. Весткі аб нашым пасьпяховым будаўніцтве даходзяць да нашых бэсарабскіх братоў, якія падвяляюць нашую радасьць і чакаюць свайго вызваленьня ад румынскіх катаў.

АДОЗВА СЭСІІ ЦВК МАЛДАЎСКАЕ АССР.

БАЛТА, 27-1. Сэсія адназгодна ўхваліла зварот да рабочых і сялян Малдавіі, у якім гаворыцца: „Румынскія баяры, захапіўшы Бэсарабію, забываюць, што гэты рабунак ня прызнаў урад саветаў, ня прызналі працоўныя СССР працоўнае Бэсарабіі. У дзесятую жалобную гадавіну мы ізноў зварочаемся да цэнтральнага ўраду СССР, каб ён праз галовы румынскіх разбойнікаў і катаў зьвярнуўся да працоўных усяго сьвету за падтрымканьнем і дапамогаю працоўным Бэсарабіі, якія змагаюцца за сваё вызваленьне. Патрабуем плебісцыту Бэсарабіі, патрабуем аб'яднаньня абедзьвюх частак аўтаномнае Малдаўскае ССР.

ПРОЦІ ГВАЛТАЎ РУМЫНСКІХ БАЯР.

БАЛТА, 28-1. Сэсіі ЦВК Малдавіі надасланы з усіх канцоў рэспублікі тэлеграмы з гарачымі пратэстамі проці гвалтаў румынскіх баяр над бэсарабскім жыхарствам. Шмат прыдняпроўскіх вёсак патрабуе ад цэнтральнага ўраду СССР досыць рашучыя захады, каб вывесьці румынскае войска з Бэсарабіі.

Такія-ж тэлеграмы прысланы бэсарабцамі, што жывуць у Маскве, Харкаве, Адэсе і іншых гарадох.

ЗМАГАНЬНЕ БЭСАРАБЦАЎ-ЭМІГРАНТАЎ ЗА ВОЛЮ БЭСАРАБІІ.

БЭРЛІН, 23-1. Таварыства бэсарабцаў у Нямеччыне агаласіла з прычыны 10-цігодзьдзя захопу Бэсарабіі пратэст, у якім зварочваецца да нямецкае грамадзкасьці з заклікам падтрымаць 2 наступныя патрабаваньні бэсарабцаў: 1) вольны выказ жаданьняў бэсарабскага народу па пытаньні аб дзяржаўнай прыналежнасьці Бэсарабіі пасьля выводу румынскага акупацыйнага войска і адмены асаднага становішча і 2) назначэньне міжнароднае следчае камісіі для вывучэньня эканамічнага і палітычнага становішча Бэсарабіі, якое стварылася ў выніку акупацыі.

Сан-гатардзкі вузел імпэрыялістычных супярэчнасьцяў.

ПАРЫЖ, 27-I. Заўэрэйн (выдатны журналіст) на старонках «Матэн» пацьвярджае весткі аб тым, што Англія, Італія і Нямеччына аказваюць процідзейнічаньне ў расьсьледваньні сан-гатарскага інцыдэнту са спробаю кантрабандыста правозу зброі праз Вэнгрыю.

Падкрэсьліваючы апрача таго, яўнае нежаданьне Румыніі пасьпяшацца з далучэньнем да калектыўнага выступленьня краёў Малае Антанты па гэтай справе, Заўэрэйн патрабуе хутчэй уладзіць інцыдэнт. Пры гэтым Заўэрэйн падкрэсьлівае, што ў іншым выпадку некаторыя дзяржавы будуць мець права ўхіліцца ад разбурэньня, грунтуючыся на тым, што Ліга Нацый ня мае сілы карацъ за парушэньне ўгавораў.

Нямецка-літоўская дагаворанасьць.

БЭРЛІН, 27-I. «Фосіше Цэйтунг» паведамляе з пэўных крыніц, што ўчарайшыя перамовы Вальдэмараса з нямецкім міністрам замежных спраў прывялі да значна большага адпадушша ва ўсіх пытаньнях, чымся раней меркаваліся. Да гэтага часу ў перамовах абмяркоўвалася выключна чыста палітычныя запыты; гаспадарчыя пытаньні будуць абмяркоўвацца пазьней. Водлуг слоў газэты, у добра асьвядомленых колах лічаць атмасфэру для падпісаньня прадугледжанага літоўска-нямецкага ўгавору аб арбітражы настолькі спрыяючаю, што ў сучасны момант ужо можна гаварыць аб падпісаньні ўгавору аб прызьвні між Літвою і Нямеччынаю.

Папская міласьць Сьмятоне і Вальдэмарасу.

Сьмятона і Вальдэмарас за сваю карысную для папы рымскага і ксяндзоў каталіцкага касьцёлу ў Літве дзейнасьць атрымалі ад папы спэцыяльныя адзнакі, якіх, як гэта ня дзіўна, не дасьлужыліся яшчэ адпаведныя асобы ў Польшчы...

Ну, і „скандал"!

РАЗГОН СХОДУ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СЯЛЯНСКАЕ ПАРТЫІ.

ВЕНА, 26-1. У Кішынёве адбыўся сход членаў нацыянальнае сялянскае партыі, на якім з дакладам аб палітычным становішчы выступіў Халіпа. Прапанаваная сходу рэзалюцыя падкрэсьлівае, што нацыянальная сялянская партыя будзе весьці рашучую барацьбу проці ўраду лібэралаў. У часе чыткі рэзалюцыі на сход зьявілася вайсковая ўлада і разагнала сход.

Форд ізноў акрыяў.

НЬЮ-ЁРК, 15-1. Форд паведаміў, што яго аўтамабільныя заводы ў Дэтройце выпушчаюць цяпер штодзень 500 аўтамабіляў. У працягу студзеня Форд намеран павялічыць выраб да тысячы аўтамабіляў у дзень.

«Калі здолець выпушчаць да тысячы аўтамабіляў у дзень, дадаў Форд, дык тым самым будзе пераможан самы цяжкі момант. Гэта значыць, што можна здолець выпушчаць аўтамабіляў колькі хочаш».

24000 ЧАЛАВЕК ПАД АЎТО.

НЬЮ-ЁРК, 15-I. У працягу 27 году ў Злучаных Штатах аўтамабілямі і матацыклеткамі было раздушана каля 24 тысяч чалавек.

ВАЙНА МІЖ „ГАМІНДАНАЎСКІМІ" ГЕНЭРАЛАМІ.

ТОКІЁ, 26-I. Водлуг паведамленьняў агэнцтва «Сімбун Рэнга», войска Бай-Цзун-Чы ўзяло ўчора Чаншу (галоўны горад і галоўны гандлёва-прамысловы цэнтр правінцыі Хунань). Бай-Цзун-Чы выпусьціў праклямацыю, у якой абвінавачвае камандуючага Хуньаньскім войскам Хо-Цьзяна ў прыналежнасьці да „чырвоных". У спраўджанасьці-ж Хо-Цьзян—суровы праціўнік рабочага рэвалюцыйнага руху; ён кіраваў контр-рэвалюцыйным пераваротам ва Ўхане ў ліпені-жніўні 1927 г. і бязьлітасна караў дзеячоў рабочага руху.

Боязь „бальшавіцкае заразы".

ПАРЫЖ, 26-1. У Бардо прыплыў савецкі параход «Чырвоны Прафінтэрн» з грузам лесу.

«Юманітэ» паведамляе, што па загадзе камісара Бардо савецкім маракам забаронены выхад на бераг без спэцыяльнага дазволу. Сакратар мясцовае арганізацыі кампартыі і сакратар клюбу маракоў былі пасьля наведваньня параходу затрыманы, але вызвалены пасьля вобыску і допыту. Рабочыя арганізацыі заявілі энэргічны пратэст проці загаду і ўчынкаў улады.

Фэдэрацыя працоўных жанчын Чыкаго.

НЬЮ-ЁРК, 15-1. Чыкагскія арганізацыі працоўных жанчын, з мэтаю пагадзіць барацьбу за скарачэньне рабочага дню, проці ўжываньня жаночае працы і за агульныя дамаганьні пралетарыяту, стварылі агульнагарадзкую фэдэрацыю арганізацый працоўных жанчын. На арганізацыйнай канфэрэнцыі агульна-гарадзкое фэдэрацыі было прадстаўлена 6 жаночых арганізацый, у якіх аб'яднана 2 тысячы працоўных жанчын.

У адозьве фэдэрацыі зазначаецца, што фэдэрацыя будзе таксама змагацца „за павялічэньне ліку школ і іх палепшаньне, проці нагрозы вайны і за дапамогу рабочым, якія церпяць рэпрэсіі за ўдзел у стачках".

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

СЬМЕРЦЬ ГІШПАНСКАГА ПІСЬМЕНЬНІКА БЛАСКО ІБАНЬЕСА.

ПАРЫЖ, 28-1. 28 студзеня ў Мэтоне памёр вядомы гішпанскі пісьменьнік Бласко Ібаньес. Ібаньес увесь час вёў упартую барацьбу супроць манархічнага ладу ў Гішпаніі, за што яго 30 раз садзілі ў турму і шмат раз высылалі з Гішпаніі. У 1925 годзе за апублікаваньне рэзкага памфлету супроць гішпанскага караля Ібаньес вымушан быў пакінуць Гішпанію і пасяліцца ў Парыжы, дзе ня спыняў барацьбы супроць караля Альфонса і дыктатара Рывэра.

ЗАКЛІК ШВЭДЗКІХ РАБОЧЫХ ДА ЗМАГАНЬНЯ З ПРАДПРЫЕМЦАМІ.

СТАКГОЛЬМ, 28-I. У зьвязку з канфліктам у горнай і папяровай прамысловасьці швэдзкая кампартыя зьвярнулася к рабочым Швэдыі з адозвай. У адозьве зазначаецца, што рабочыя павінны дружна патрабаваць вырашэньня канфлікту ва ўсіх адносінах, бо прадпрыемцы спрабуюць разьяднаць рабочых, каб прадыктаваць ім умовы паасобку.

АД'ЕЗД КУРСКАГА Ў ІТАЛІЮ.

МАСКВА, 28-1. Зноў назначаны паўнамоцны прадстаўнік СССР у Італіі Курскі выехаў 28-га студзеня ў Рым.

ЗАТРЫМАНЬНЕ АФЭРЫСТАЎ.

УЛАДЫВАСТОК, 28-1. АДПУ затрымала ў Нікольска-Ўсурыйскім краі двох афэрыстаў, спрабаваўшых перабрацца за граніцу. Апрача 114326 руб., у арыштаваных знойдзена шмат золата і дыямэнтаў. Выявілася, што адзін з арыштаваных—былы казначэй Ленінградзкага Дзяржбанку Салаўёў, а другі—Турчанаў, казначэй банку.

У Саюзе ССР.

На хлебазагатоўчым фронце.

КРАСНАДАР. За пятую пяцідзёўку загатавана 1084 тысячы пуд. збожжа на 63 проц. больш, чымся за 4-ю. Гэты тэмп загатовак гарантуе выкананьне студзёўскага пляну поўнасьцю.

* * *

НАЛЬЧЫК, 27-1. На 26 студзеня Кабардзіна-Балкарская вобласьць выканала 103 проц. заданьня па хлебазагатоўках.

ОМСК. Омскае аддзяленьне «Хлебапрадукту» ідзе па хлебазагатоўках на апошнім месцы, выканаўшы толькі 18 проц. заданьня. Кіраўнік аддзяленьня Ральнікаў зьняты з працы. Загадчык хлебазагатоўчым аддзелам с.-г. крэдытнага саюзу Гусельнікаў вынёў злачынную бяздзейнасьць, за што зьняты з працы і арыштаваны.

Чыгуначніі на варце гаспадарчага фронту.

МАСКВА, 27-1. 27-га студзеня адбыўся ўрачысты пленум ЦК саюзу чыгуначнікаў супольна з прафсаюзным актывам маскоўскага чыгуначнага вузла, прысьвечаны 10-цігодзьдзю саюзу. З прывітальнымі прамовамі ад імя УсеКП(б) і НК шляхоў выступіў нарком шляхоў т. Рудзутак. Адзначыўшы выдатную ролю чыгуначнікаў у часе грамадзянскае вайны і ў адноўленьні порыд савецкае дзяржавы, Рудзутак заявіў, што перад транспартнаю гаспадаркаю пастаўлены новыя задачы. Яны асабліва цяжкія, бо мы будуем нашую гаспадарку на новай тэхнічнай базе. Рэканструкцыя транспарту, замена рабочае сілы машынамі, пераход на 7-мігадзінны рабочы дзень—вось чарговыя задачы высокага палітычнага і тэхнічнага значэньня. Яны могуць быць выкананы пры ўмове бесьперабойнае працы нашага чыгуначнага транспарту, для чаго неабходна дамагчыся лепшае арганізацыі транспартнае гаспадаркі і ўсебакова яе ўзмацніць. Вітаючы саюз чыгуначнікаў з 10-цігодзьдзем існаваньня, Рудзутак выказаў пажаданьне, каб у далейшым саюз вынёў ня менш дысцыпліны і загартаванасьці, чымся ў гады грамадзянскае вайны. Трэба памятаць,—скончыў Рудзутак—што мы ўвесь час зьяўляемся барацьбітамі на гаспадарчым фронце. Я пераконаны, што магу запэўніць партыю і ўрад, што саюз чыгуначнікаў на варце.

На пленуме былі ўдзельнікамі шматлікія прывітаньні ад саюзаў чыгуначнікаў Англіі, Францыі, Амэрыкі, Заходнае Афрыкі і інш. краёў.

2-я нарада пры НК РСІ па рацыяналізацыі.

МАСКВА, 26-1. 26-га студзеня праводзілася далей шырокая нарада прадпрыемскіх камітэтаў, прадстаўнікоў гаспадарчых арганізацый і кіраўнікоў рацыяналізатарскае працы прадпрыемстваў і фабрычна-заводзкіх арганізацый па пытаньнях аб рацыяналізацыі вытворчасьці і задачах органаў РСІ ў гэтай галіне.

З пунктам гледжаньня ВСНГ на пастаноўку рацыяналізатарскае працы азнаёміў намесьнік старшыні прэзыдыуму ВСНГ СССР і старшыня ВСНГ РСФСР т. Лобаў. На сучаснай нарадзе, сказаў Лобаў, выявіліся два пункты гледжаньня. Адзін гаворыць, што трэба адразу ўводзіць амэрыканскую тэхніку, зьвяшчаць старое, уводзіць новае. Па думцы іншых, трэба прыстасоўваць да патрэб усё абсталяваньне, якое ў нас ёсьць. Гэты пункт гледжаньня найбольш правільны, але аднак мае крайнасьці і тут захапляцца ня трэба. Будзе вельмі кепска, калі мы будзем хаваць непатрэбнае нам стар'ё. Як будзем прапаваць? Як агульнае правіла, мы павінны праводзіць рацыяналізацыю сваімі сіламі але ў асобных выпадках павінны прыцягваць і чужаземных інжынэраў.

Выступаўшы ў спрэчках Шэйн высунуў думку аб неабходнасьці заснаваньня вышэйшага савету рацыяналізацыі, які павінен знаходзіцца пры НК РСІ, бо ў справе рацыяналізацыі зацікаўлены ўсе наркаматы. У апошніх таксама павінны быць аддзелы рацыяналізацыі, працуючыя над агульнымі кіраўніцтвам вышэйшага савету, які будзе высоўваць агульныя пытаньні, не закранаючы дэталяў.

Проці аб'яднаючага цэнтру рацыяналізатарскае працы нарачыў Яросаў, водлуг пераконьня якога, чымся вышэй орган, тым ён далей ад магчымасьці рацыяналізаваць прадпрыемствы. Ніхто, апрача органаў, закліканых кіраўваць і адказваць за працу, не павінен аб'ядноўваць рацыяналізацыю.

Абмен думкамі скончыўся. Аржаніцкі з падрахаваў вынікі двох пасяджэньняў нарады.

Працэс біскупа Скальскага.

Скальскі засуджан да 10-ці гадоў астрогу.

МАСКВА, 27-1. Працэс Скальскага скончыўся 27 студзеня. Пракурор падтрымліваў абвінавачаньне ў контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці і ў шпіянажы на карысьць чужаземнае дзяржавы. З прычыны таго, што ўсё гэта было ўчынена перад амністыяй у адзнаку 10-х угодак Кастрычніцкавае рэвалюцыі, пракурор прапанаваў замест вышэйшае меры пакараньня—10 гадоў астрогу з пазбаўленьнем правоў на 5 гадоў.

Вярхоўны суд пасьля 2-хгадзіннае нарады прызнаў даказанымі ўсе абвінавачаньні, апроч шпіянажу, і засудзіў Скальскага на 10 гадоў зьняволеньня з пазбаўленьнем правоў на 5 гадоў.

ТРАКТАРЫ ДЛЯ ПРАМЫСЛОВЫХ МЭТ.

ЛЕНІНГРАД, 26-1. На Чырвоным Пуцілаўцы пачынаецца выраб трактараў для прамысловых мэтаў: лесазагатоўкі, рыбалоўства і шляхавае працы. Рыбалоўныя трактары будуць служыць для выцягваньня невадоў; агэін трактар заменіць 120 рыбаловаў. Пры дапамозе шляхавых трактараў можна будзе пракласьці дарогі на адлегласьці 50-60 кілёмэтраў у дзень.

ЗАБОЙСТВА КУЛАКАМІ ВЯСКОВАГА АКТЫВІСТА.

ПАЎЛАЎСК на АЦЭ. 27-1. У вёсцы Горыцы кулакі забілі старшыню камітэту ўзаемадапамогі, партыйца з 1918 г., Гарасіма Іванова. Забойцы выкалалі Іванову вочы. На справе арыштавана 6 чалавек.

НОЎГАРАДЗКАЯ РЫБА ЗА ГРАНІЦАЮ.

НОЎГАРАД, 27-1. Пасьля 10-хгадовага перапынку пачынаецца экспорт ноўгарадзкае рыбы ў Польшчу, Францыю і Нямеччыну. На возеры Ільмень спушчана спэцыяльнае суднo, якое будзе дастаўляць рыбу ў Ноўгарад, адкуль яна будзе грузіцца ў халадзільнікі для пасылкі за граніцу.

ЭЛЕКТРЫЧНАСЬЦЬ У ВЁСКУ.

БРАНСК, 24-1. У вёсцы Бутры, Бежаўскага павету, адбылося ўрачыстае адчыненьне новапабудаванае электрастанцыі магутнасьцю ў 60 конскіх сіл. Будзе электрыфікавана 6 вёсак—блізка 600 двароў, больніца і школа.

Трацкіст пад маскаю прыхільніка ЦК.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 27-I. Пастановаю округовае кантрольнае камісіі выключан з партыі партпрацаўнік Вольпэр, які ўсюды выступаў, як прыхільнік ЦК, а на справе ўваходзіў у бюро трацкісцкага камсамолу. Вольпэр на сваёй кватэры наладжваў парады трацкісцкага камсамольскага актыву і браў чынны ўдзел у фракцыйнай працы.

ЗВАЛЬНЕНЬНЕ З ПАСАДЫ ЗА ХАЛАТНАСЬЦЬ.

ЛУГАНСК, 24-I. Парткалегія ўхваліла звольніць з пасады кіраўніка мясцовага аддзелу ВАКОТ'а Бандарэнку за невыкананьне дырэктывы аб перадачы дэфіцытных тавараў над загад кампэрацыі і прыцягнуць яго да адказнасьці. Намесьнік кіраўніка заводу таксама звальняецца з пасады і аддаецца пад суд.

Арышты рабочых у Гаваньне.

НЬЮ-ЁРК, 27-I. 27-га студзеня камуністычная газэта «Дэйлі Ўоркер" паведамляе з Гаванны аб шматлікіх арыштах рабочых і студэнтаў, абвінавачваемых у распаўсюджаньні камуністычнае літаратуры.

ПАШЫРЭНЬНЕ САВЕЦКА-АМЭРЫКАНСКАГА ГАНДЛЮ.

НЬЮ-ЁРК, 15-І. У 1927 г. у Злучаных Штатах было разьмеркавана савецкіх заказаў на суму 31 міліён 199 тысяч 834 даляры проці 8681412 даляраў у 26 г. У гэтую суму ня ўключаюцца закупкі бавоўны Тэкстыльным Сындыкатам, якія за апошні год склалі 42 міліёны даляраў проці 35 міліёнаў у 26 г. Агульны зварот гандлю СССР з Злучанымі Штатамі складае за 27 г. каля 100 міліёнаў даляраў проці 70 міліёнаў даляраў у 26 г. і 48 міліёнаў даляраў у 1923 годзе.

НЬЮ-ЁРК, 15-1. Міністэрства гандлю Злучаных Штатаў у агалошаным агляде эўрапэйскіх рынкаў заяўляе: «Палітыка індустрыялізацыі, намечаная савецкім урадам, знайшла свой адбітак у характары імпорту ў СССР у 1927 г. Вываз складаўся са сродкаў вытворчасьці. Вываз рэчаў шырокага спажываньня быў вельмі абмежаваны. Савецкія закупкі ў Злучаных Штатах ад часу англа-савецкага разрыву значна павялічыліся. Заказы, разьмешчаныя Амгандлем у працягу 26-27 апэрацыйнага году перавысілі ў два разы заказы за папярэдні год».

РЭПРЭСІІ ПРОЦІ САСЛАНЫХ ІТАЛЬЯНСКІХ КАМУНІСТАЎ.

ВЕНА, 22-1. З Рыму паведамляюць, што ўчынены шматлікія арышты сярод асоб, высланых на выспу Ўсьціку пасьля замаху на Мусаліні ў кастрычніку 1926 г. У большасьці арыштаваны камуністы, проці якіх высунуты розныя хлусьлівыя абвінавачваньні, аснованыя на даносах паліцэйскіх шпікаў. Становішча сасланых на выспу Ўсьціку наогул нясупынна пагоршваецца. Бязупынна ўчыняюцца вобыскі, пры якіх забіраюцца грошы і рэчы. Школы пісьменнасьці, арганізаваныя сасланымі, зачынены. На ўсе спробы сасланых палепшыць сваё становішча ўлада адказвае новымі рэпрэсіямі і пагрозамі.

Перамога францускіх чыгуначнікаў.

ПАРЫЖ, 27-I. Выбары прадстаўнікоў у «вышэйшую раду чыгунак» сярод чыгуначнікаў скончыліся перамогаю ўнітарных прафсаюзаў. Абрана 131 дэлегат з высунутых рэвалюцыйным саюзам чыгуначнікаў, 45 рэфармістаў і 20 ад саюзаў, якія не далучаюцца ні да аднае з фэдэрацый.

ЗАЎВАГА: „Вышэйшая рада чыгунак" узгадняе дзейнасьць розных чыгунак у пытаньнях—тэхнікі, заработку і г. д. У дзейнасьці яе, зьвязанай з пытаньнямі рабочае працы, дазваляецца ўдзел з правам дарадчага голаса прадстаўнікоў прафсаюзу чыгуначнікаў.

Гэтыя выбары адзначаюцца тым, што члены перамогшых на выбарах рэвалюцыйных прафсаюзаў упяршыню актыўна бяруць удзел у іх. У мінулым яны абмяркоўваліся падачаю пустых бюлетэняў.

Савецкая нафта на Цэйлёне.

ЛЁНДАН, 19-1. Водлуг паведамленьняў ангельскага друку, „Стандарт Ойль Кампані" вывозіць савецкую нафту на выспу Цэйлён.

Друк зазначае, што гэта першы выпадак канкурэнцыі з азіяцкаю нафтаваю кампаніяю, якая дагэтуль фактычна манапольна дастаўляла на выспу нафту.

За дзень.

„У кішэні Монда".

Генэральная рада ангельскіх прафсаюзаў пайшла на агульную канфэрэнцыю з прамыслоўцамі. Праблема «міру ў прамысловасьці» Макдональдам у саюзе з прамыслоўцамі ставіцца на практычны грунт. Прамыслоўцы разыгрываюць з сябе дурачкоў, што быццам не яны зацікаўлены ў гэтым «міру», а прафэсыянальныя саюзы. Факт таму, што галоўныя клопаты па гэтаму пытаньню робяць Макдональд, Хікс, Спэнсэр і інш. г. зв. лідэры ангельскага рабочага руху.

Ды ня толькі ініцыятыву ўзялі на сябе рабочыя лідэры. Пасьля вострага выступленьня лідэра гарнякоў Кука супроць гэтай канфэрэнцыі, а таксама супроць самае ідэі аб «міру ў прамысловасьці», з адказам на яго прамову выступілі яго таварышы па генэральнай радзе, а не прамыслоўцы, якія таксама прынялі актыўны ўдзел на канфэрэнцыі. І гэта зусім зразумела: навошта прамыслоўцам пэцкаць рукі ў гэтай справе, калі ў іх ёсьць добрыя падхалімы, накшталт Хікса і Макдональда, якія самі возьмуць на сябе гонар яму адказаць.

Генэральная рада рыхтуе генэральную здраду,—вось што зараз заўважаем ня толькі ў пытаньні аб канфэрэнцыі, але ва ўсёй палітыцы лідэраў ангельскіх прафсаюзаў. Гэтыя лідэры выдаюць рабочую клясу з галавой на расправу фабрыкантам і заводчыкам. Ужо на гэтай канфэрэнцыі Кук адзначыў, што генэральная рада прафсаюзаў «ужо знаходзіцца ў кішэні Монда». Монд—прамыславец, якія на гэтай канфэрэнцыі выступіў з уступнаю прамоваю аб «міру ў прамысловасьці» і прамоўцы ад прафсаюзаў ня толькі ня выступалі хоць з адным словам супроць яго прапаноў, але цалкам на іх згадзіліся.

Шчырасьць ці шантаж.

Увесь францускі друк у апошнія часы шмат піша аб неабходнасьці шчыльнага эканамічнага супрацоўніцтва з Нямеччынай. Ня трэба доўга задумвацца над тым, што ўсё гэта зьвязана з надыходзячымі перавыбарамі ў францускі парлямант. Кожная з партый спрабуе паказаць, што яна за ажыўленьне адносін з Нямеччынай, бо бліз гэтага францускі гандаль віяк ня можа распаўсюджваць свой уплыў. Нават тыя з найбольш заўзятых францускіх мілітарыстаў, якія ўвесь час крычалі, што «Нямеччына ўсё заплаціць», таксама схіляюцца да неабходнасьці шчыльнага супрацоўніцтва. Прыезд у Парыж рацэйшага канцлера Нямеччыны Бірка і крыём Пуанкарэ зьяўляецца першай ластаўкай на гэтым шляху.

Больш таго, у Ніццы ў студзені г.г. на зьезьдзе францускіх гандлёвых дарадчаў выступіў дэ-Монзі з прамовай наступнага зьместу:

«Неабходна, каб францускія і нямецкія пастаўкі ў СССР рабіліся, папершае—па аднолькавых цэнах, падругое—на аднолькавых камэрцыйных умовах і, патрэцце—з аднолькавымі гарантыямі. Няма магчымасьці заключаць гандлёвыя зьдзелкі з СССР, калі кожнаму законнаму патрабаваньню Францыі будуць супярэчыць прывілеі, атрыманыя Нямеччынай і ў зьвязку з гэтым высунутая канкурэнцыя».

Заява дэ-Монзі ідзе значна далей і гаворыць ня толькі аб эканамічным супрацоўніцтве, але і аб адзіным палітычным фронце ў адносінах да СССР. Для нас зусім зразумела падобная заява дэ-Монзі. Францыя ўжо даўно не спадзяецца па якія-небудзь уступкі з нашага боку і таму яна хоча прымусіць Нямеччыну, каб тая пайшла з ёю разам і гэтага дасягнуць агульнымі сіламі.

Але эканамічнае супрацоўніцтва вымагае таксама і палітычнага, а гэта немагчыма, **ПАКУЛЬ** існуе Данцыгскі калідор, **ПАКУЛЬ** над Усходняй Прусіяй вісіць польская пагроза, **ПАКУЛЬ** Рэйнская правінцыя акупавана Францыяй, **ПАКУЛЬ** Нямеччына не атрымае хоць частку сваіх калёній. Таму, гэткае выступленьне дэ-Монзі мае сваёй выключнай мэтай шантажыраваць СССР, які, быццам, пад пагрозай франка-нямецкага руху пойдзе на ўступкі.

Нічога з гэтага ня выйдзе. Пас ня так застрашалі і з гэтага таксама нічога ня выходзіла.

Што будзе?

Скончыўся нэрыяд складаньня дзяржаўных выбарных сьпісак. Цяпер усе палітычныя групоўкі Польшчы заняты «дамовымі» справамі складаньня акруговых сьпісак. Гэтая работа таксама скора скончыцца, але яна носіць характар ужо больш тэхнічны, ніж палітычны. Фактычна палітычныя шахматы ўжо расстаўлены і зроблены амаль ні апошнія крокі.

Хто выйграе?

Кожны ня з двух, а з 33 падаўшых дзяржаўныя сьпіскі, хоча выйграць. Пры такім ліку ігракоў можна думаць, што Польшча ня выйграе. 4 сакавіка адбудзецца падзел мандатаў між 33 ігракамі, якія змагаюцца за ўплыў на народныя масы.

Пакуль што трэба сьцьвердзіць, што распыленьне палітычнай думкі Польшчы яшчэ больш павялічылася. Урад аб'яднаў вакол сябе самыя разнастайныя групы, пачынаючы ад абшарнікаў і канчаючы радыкаламі авантурніцкага тыпу.

Блёк нацыянальных меншасьцяў выглядае непараўнана слабейшым, ніж пяць гадоў таму назад. Да яго не належаць сацыялісты розных кірункаў—ні нямецкія сацыялісты, ні Бунд, ні Паолей-Сіён, ні украінскі Сель-Роб, ні украінскія сацыял-дэмакраты; не далучылася да яго цэлая яўрэйская «ортодоксія» разам з Прылуцкім; не далучылася таксама і частка сялянстаў з п. Рэйхам, ні—ўрэшце—розныя меншыя групы украінскія і беларускія.

Беларусы, якія не далучыліся да блёку нацыянальных меншасьцяў, ня выставілі сваіх дзяржаўных сьпісак. Але гэта ня значыць, што яны ня выступяць на выбарах на акругах.

Нам

Польшча напярэдадні выбараў.

«Глос Правды» і выбары.

Рэдактар услужаючай ураду газэты „Глос Правды“ В. Сычынскі напісаў перадавіцу, у якой гаворачы на тэму аб колькасьці выбарных сьпіскаў у сойм і сэнат, кажа: „ня трэба быць прарокам, каб зразумець, што парлямант, у які будзе спляцацца палітычны розум 34 каналамі выбарных сьпіскаў... апініцца ў страшэннай беспрарорцыі сіл“... І таму, на думы п. Сычынскага, такі парлямант ня можа і ня мае права перашкаджаць дзяржаўнай творчасьці галавы сучаснага ўраду.

Непапулярнасьць блёку м-цменшасьцяў сярод беларусаў.

«Кур. Віл.» піша, што „ў сувязі з выхадам Ліцьвіноў з блёку, як роўным чынам у сувязі з шаркім разьвіньцём дзейнасьці Бел. Сял. Партыі Я. Станкевіча, шансы беларускіх арганізацый, якія ўваходзяць у блёк, значна паменшыліся. Магчыма, піша „К. В.“, што беларусы з блёку паменшасьцяў не атрымаюць аніводнага мандату.

Мамонька ідзе на выбары.

„Дз. Віл.“ (№ 20) паведамляе, быццам беларускія эсэры на чале з Мамонькай усё-ж такі ідуць на выбары. Яны выстаўляюць свае сьпіскі ў Сьвянцянскай, Лідкай і Новагрудзкай округах.

Новы арышт б. пасла Шапеля.

25 студзеня г.г. на распаряджэньні пракурорскай улады арыштован б. пасол Шапель. Яго абвінавачваюць у тым, што ён кіраваў сьвянцянскім камітэтам незалежнай сялянскай партыі, якая была зачынена разам з Беларускай Грамадой. З Сьвянцян Шапель перавезен у Вільню на Лукішкі.

Суд над украінцамі.

25 студзеня г. г. у Львове пачаўся суд над абвінавачанымі ў забойстве куратара Львоўскай школьнай акругі Сабінскага. Акт абвінавачэньня мае 150 старонак. Абвінавачваецца д 20 асоб.

У Заходняй Беларусі.

Сацыял-авантурнікі.

ВАРШАВА, 27-I. На чале сацыялдэмакратычнае літоўскае партыі, якая арганізуецца ў Вільні, стаіць сацыялдэмакрат Анцавічус (адзін з бліжэйшых супрацоўнікаў Плячкайціса).

Чародная канфіскацыя.

Па загаду пракурорскай улады сканфіскован № 7 беларускай радыкальнай газэты „Думкі Працы“, №№ 5 і 6 таксама былі сканфіскаваны.

Павялічэньне беспрацоўя.

Лік беспрацоўных у Вільні цяпер раўняецца 4828 асобам, з іх мужчын—3400, кабет—1418. У апошнім часе лік беспрацоўных павялічыўся на 236 асоб.

Зьезд т-ва беларускай школы ў Навагрудку.

Нядаўна ў Навагрудку адбыўся зьезд т-ва бел. школы Навагрудчыны па які зьявілася каля 100 асоб. Справаздачу аб становішчы справы беларускай школы зрабіў старшыня т-ва Чатырка, які засьведчыў, што на абшары Навагрудскага пав. ёсьць 54 школьныя гурткі, якія налічваюць звыш 2.000 членаў. У адным сьнежні м-цы мін. году гурткі зарганізавалі 73 спэктаклі.

У склад перавыбранага прэзыдыуму ўвайшлі: А Аляшкевіч, Ант. Малец, П. Грыц, Ул. Журко і М. Чатырка.

Скандальны канец.

У нашай газэце былі ўжо заметкі і артыкулы аб тым, што ў Вільні мо‘ з месяц таму назад залажылася новая польская партыя пад назвай: Краёвая народная партыя «Аб‘яднаньне», якая паставіла сваёю мэтаю дабівацца пры выбарах у сойм і так наогул тэрытарыяльнай аўтаноміі для беларуска-літоўскіх зямель, уваходзячых цяпер у склад Польшчы.

Гэтае «Аб‘яднаньне» склалася з некалькіх асобных партый і груп: групы „краёўцаў“, партыі дробных земляробаў, сялянскай партыі і «беларускай» радыкальнай партыі п. Умястоўскага.

Мы адзначылі ў свой час гэты факт, як некаторае прасьвятленьне ў мазгох часткі польскай і спольчанай міжнацыянальнай інтэлігенцыі, якая ўрэшце пераканалася, што далей ісьці ў адносінах да беларуска-літоўскіх спраў па шляхох польскіх урадаў рознай афарбоўкі ня можна і што трэба цьвёрда стаць на грунт краёвасьці і аўтаноміі для памянёных зямель.

Усім гэтым зьліўшымся ў адну групу партыям здавалася нават, што яны знойдуць для сваёй мэты падтрыманьне і спагад з боку ўраду Пілсудзкага і ўсяго так званага санацыйнага лягеру.

Што-ж аказалася на справе?

21 студзеня г. г. у Вільні адбылося, як піша «Кур‘ер Віленскі» (№ 17), пленарнае пасяджэньне Управы Краявой Народнай Партыі «Аб‘яднаньне», у якім прыняло ўдзел 29 членаў управы і 20 делегатаў з павятовых управаў. Між іншым, на парадку дню стаяла і справа аб адносінах «Аб‘яднаньня» да выбараў. Пасьля доўгіх дэбатаў, насуроць прапазіцыі, каб ісьці на выбары самастойна, або злучыцца з сялянскай партыяй, пастаноўлены аграмадзнай большасьцю галасоў проці сямі ня лічыцца ні з водпаю партыяю, а галасаваць за сьпісак «Беспартыйнага Блёку Супрацоўніцтва з Урадам», які ня толькі „краёвай“, а і наогул ніякай праграмы ня мае і лёзунгам якога зьяўляецца: «Мы з камэндантам! Ён усё зробіць! Проч з рознымі партыямі».

Вось якім трагі-камічным фіналам скончылася «краёвая» эпоха. Яе ўгробілі элемэнты, якія сьлепа ідуць з сучасным польскім урадам, угробілі так, як і падабае пілсудчыкам: спачатку пасуламі, абіцанкамі, эквівокамі далі з'арганізавацца, а потым разваліл.

Пасьля гэткага скандалу б. правадыры „Аб‘яднаньня“ і разам б. паслы сойму: Вэндзягольскі, Дуброўнік і Адамовіч выступілі з арганізаванай імі «краёвай» партыі і зноў вярнуліся ў сваю сялянскую партыю.

Яшчэ раней выступіла з «Аб‘яднаньня» „Партыя дробных земляробаў“. У «Аб‘яднаньні» засталіся толькі «беларус» п. Умястоўскі і стары ідэалёг «краёвасьці» адв. Абрамовіч з элемэнтамі, якія краёвую ідэю памянялі на пусты гук: «мы з камэндантам»!

Пры такім палажэньні, пры ўтварыўшаўся ўнутры „краёвага аб‘яднаньня“ сітуацыі, у ім няма месца і застаўшымся яшчэ на непаразуменьні п. п. Умястоўскім і Абрамовічам, калі яны сур'ёзна сталіць за ідэю краёвасьці і аўтаноміі беларуска-літоўскіх зямель і калі яны, падымаючы сьцяг краёвасьці, ня мелі на мэце прадаць справу за ломаны грош, абы самім высунуцца на палітычную паверхню.

Наогул-жа, як мы ўжо ня раз пісалі, перадвыбарчай дэманстрацыяй ідэі краёвасьці і сакодкімі пасуламі аўтаноміі для беларуска-літоўскіх зямель некаторыя польскія палітыкі толькі забаўляюцца—дзеля сваіх уласных мэт.

Развал «Аб‘яднаньня», якім яно была спачатку, зьяўляецца найлепшым доказам правільнасьці нашых думак аб нясур'ёзнасьці польскіх «краёвых» імкненьняў, а папыткі іх выяўленьня зьяўляюцца вельмі падобнымі на дэфэнзыўную правакацыю. **М. Лучанін.**

„Летува“ не давярае Польшчы.

Урадавая „Летува“, абгаварваючы галасы польскай прэсы ў справе адказу Вальдэмараса на польскую ноту,—піша, што міністр Залескі, сьцісканчы ў Жэневе руку Вальдэмараса, трымаў за пазухай укрыты нож, які хоча ўсадзіць у цела Літвы. У Жэневе паўтарылася гісторыя з Падэрэўскім, пасьля пажацьця рукі якога выступіў на сэйму Жэлігоўскі.

Лібава і Лібава-Роменская чыгунка.

Ужо пасьля апэрэтачнае сцэны жэнеўскага прымірэньня паміж Літвою і Польшчаю зьявіліся ў друку весткі аб зьнішчэньні Літвою часткі Лібава-Роменскай чыгункі са зьняцьцем рэек на працягу некалькіх дзесяткаў кілёмэтраў. Гэты факт зьявіўся вельмі яскравым адказам на абапольныя мірныя заявэньні ў Жэневе і яскравым паказчыкам сапраўдных настрояў літоўскага ўраду ў адносінах да Польшчы. Жэнеўская згода абавязвае Літву і Польшчу спыніць становішча вайны паміж імі і наладзіць нармальныя ўзаемаадносіны як палітычныя, так і гаспадарчыя.

У апошніх самае важнае значэньне дзеля Польшчы мае адчыненьне транзіту праз Літву да Балтыцкага мора: шляхам на Нёмне і чыгуначным—на Лібаву. Зьнішчэньне часткі Лібава-Роменскае чыгункі зьяўляецца з боку Літвы падгатоўкаю да перамоў аб наладжаньні польскага транзіту. Калі заходнія дзяржавы прымушаюць Літву адчыніць транзіт на Лібаву, дык літоўскі ўрад стараецца, каб гэты транзіт стаў практычна невыпаўнімым, каб замест зьнімаемае юрыдычнае перашкоды (забароны літоўскага ўраду) выраслa-б фактычная перашкода ў выглядзе адсутнасьці чыгункі.

Учынкі літоўскага ўраду выклікалі востры пратэст на старонках латвійскіх газэт і моцны непакой у латвійскіх гаспадарчых колах.

У Латвіі ўвесь час спадзяваліся, што раней ці пазьней Літва і Польшча дойдуць да згоды, і Лібава-Роменская чыгунка ізноў запрацуе поўным тэмпам, даючы выхад да мора грузам ня толькі з Латвіі альбо Літвы, але таксама з Віленшчыны, Савецкае Беларусі і Савецкае Украіны—адным словам, з усіх тых абшараў, з якіх ішлі грузы ў Лібаву перад вайною. Ну а тады прачнецца ад свайго летаргічнага сну Лібаўскі порт, закіпіць новым жыцьцём, уплываючы дадатна на ўсё гаспадарчае жыцьцё Латвіі.

Латвійскі ўрад пад націскам гандлёвае буржуазеі Латвіі некалькі разоў паціху зьвяртаўся да літоўскага ўраду з просьбаю аб аднаўленьні транзіту па Лібава-Роменскай чыгунцы, але кожны раз бяз посьпеху. Дзеля гэтага зразумела, чаму нішчэньне Лібава-Роменскае чыгункі, якое кладзе канец усім надзеям на ажыўленьне Лібавы, выклікала вострыя водгукі ў латвійскім друку і грамадзтве.

У даваенным часе Лібава адыгрывала вельмі важную ролю ў гаспадарчым жыцьці ўсяе Расеі, асабліва-ж Літвы, Беларусі і Украіны. Але не ўплыў адчуваўся і далёка на Ўсход у самой Вялікарасеі. Лібаўскі порт меў шырокаразгалінёную чыгуначную сетку, спэцыяльныя прылады дзеля разгрузкі тавараў і спэцыяльныя склады і элеватары дзеля паасобных тавараў (збожжа, яек, селядцоў і г. д.) Пры гэтым Лібаўскі порт меў даволі глыбіні, каб прыймаць самыя вялікія акіянскія параходы і быў зьвязаны параходнымі лініямі з усімі найважнейшымі партамі сьвету. Праз Лібаву праходзіла значная частка ўсіх эмігрантаў з Расеі.

Пасьля таго, як ваенная бура заціхла, Лібава аказалася ў становішчы страшнага ўпадку, з якога ня можа падняцца і дагэтуль. Спыненьне дапыву тавараў з СССР і Заходняе Беларусі адчуваецца вельмі востра. Закаркаваньне Лібава-Роменскае чыгункі Літвою спыніла дапыў беларускіх і украінскіх тавараў па самаму кароткаму і дагоднаму кірунку. Што-ж датычыць вакольнага шляху праз Мітаву, дык СССР'аўскі транзіт ня можа кіравацца па гэтай лініі на Лібаву, бо лінія Мітава—Лібава мае вузкую эўрапэйскую калёіну, і тавары павінны перагружацца, у той час, як да Рыгі яны даходзяць без перагрузкі, бо да Рыгі ідзе калёіна СССР'аўскага тыпу. Гэтым, галоўным чынам, і тлумачыцца той факт, што агульны таннаж суднаў, якія за год заходзяць у Лібаву, у 1926 г. дайшоў толькі да 28 проц. даваеннага ў той час, як у Рызе—да 44 проц. і Віндаве—45 проц. Дзеля гэтага латвійскі ўрад і распачаў у 1925 г. будаваньне шырокакалёіннае чыгункі Лібава—Глуды. Але і яна ня вырашыць цалкам праблему будучыні Лібавы.

Па вестках біржавога камітэту, у Лібаве агульная колькасьць прывезеных у Лібаву па чыгунцы тавараў за 1909-1913 год у сярэднім была роўнаю 934426 тоннаў у год, у тым ліку з уласьцівае Расеі 508197 тоннаў, а з Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны—432717 тоннаў. Вывозілася-ж з Лібавы па 300540 тоннаў штогодна, у тым ліку ў Расею—127869 тоннаў, а ў Літву, Польшчу, Беларусь і Украіну—172131 тонна.

У 1922-1926 г. прывоз у Лібаву тавараў па чыгунцы быў роўны ў сярэднім 100000 тоннаў штогодна, альбо 11 проц. даваеннага; вываз-жа з Лібавы—65000 тоннаў у год, альбо 13 проц. даваеннага.

Процэнтны ўдзел Лібавы ў марскім прывозе да Латвіі падае: 1921 г.—25,1 проц., 1922 г.—18,3 пр., 1923 годзе—14,3 пр., 1924 г.—15,8 проц., 1925 г.—11,4 пр. і 1926 г.—11,7 проц. Таксама падае і доля Лібавы ў марскім вывазе з Латвіі: за 1921-1926 г. адпаведна па чарзе: 8,8 пр., 14,6 пр., 11,7 пр., 11,2 пр., 9,5 пр. і 7,9 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць, што **заміраньне Лібавы ўсё яшчэ паглыбляецца**; другія гавані Латвіі ўсё болей і болей адсоўваюць яе на задні плян.

Гэтае заміраньне Лібавы зьяўляецца (як гэта правільна заўважваюць латвійскія газэты) асноўнаю перашкодаю на шляху латвійска-літоўскага зблiжэньня. Сколькі ні адбывалася ўсякіх парадаў і канфэрэнцый па гэтай справе, але ўсе яны, як правіла, канчаліся нічым. У сучасны момант у сувязі з нішчэньнем Лібава-Роменскае чыгункі можна чакаць далейшага абвастрэньня латвійска-літоўскіх узаемаадносін.

Але гэты факт нішчэньня Лібава-Роменскай чыгункі мае немалаважную цікавасьць і дзеля нас у сувязі з тэй вялікай роляй, якую яна адыгрывала (і будзе адыгрываць у будучыне) для Беларусі і Украіны, для выхаду нашых і украінскіх тавараў на Балтыцкае мора. Таму мы павінны пільна прыглядацца да разьвіцця латвійска-літоўска-польскіх перагавораў аб Лібава-Роменскай чыгунцы і транзіце на Лібаву.

М. С.

Пагстаньне корпусу ген. Доўбар-Мусьніцкага.

(З эпізоду грамадзянскай вайны).

Адною з першых сур'ёзнага абхвату апэрацый Чырвонай гвардыі трэба лічыць ліквідацыю паўстаньня польскага корпусу генэрала Доўбар-Мусьніцкага. Гэты корпус вылучыўся з старой царскай арміі пры яе распадзе. Ад самага пачатку ён траніў у рукі контррэвалюцыйнага афіцэрства. Антанта, будуючы пляны аднаўленьня ў нас антынямецкага фронту, спадзявалася, што гэты корпус таксама адыграе вядомую ролю: між іншым яму меркавалася даручыць дзейнічаць у райёне Менску—Магілеву. На тэты-ж корпус вялікую надзею ўскладаў генэрал Карнілаў, а затым і генэрал Духонін.

Аб контр-рэвалюцыйных настроях гэтага корпусу даведалася савецкая ўлада і рашыла яго разброіць. У адказ на гэтае разброеньне корпус узьняў паўстаньне ў райёне Жлобін—Рогачоў—Бабруйск. Пачатковая спроба разваліць паўстаўшы корпус праз агітацыю ня ўдалася і давялося ўжыць сілу.

Корпус налічваў 12 стралковых і 3 кавалерыйскія палкі. Дзьве дывізіі гэтага корпусу ўжо згрупаваліся ў гэтым райёне, а трэцяя дывізія прабіралася да яго.

Спробы розных чырвонагвардзейскіх атрадаў разброіць корпус не далі вынікаў і, наадварот, польскі корпус сам перайшоў у наступ і пачаў пагражаць Магілеву. Давялося выклікаць з фронту найбольш моцныя рэвалюцыйныя часьці і арганізаваць сур'ёзны наступ проці паўстаўшых палякаў.

Два кірункі вялі да райёну польскага корпусу. Адзін ад Магілева на Рагачоў, а другі ад Гомелю на Жлобін. На чале першага кірунку, разам з латыскімі палякамі, становіцца тав. Вацятыс, які пазьней стаў першым галоўнакамандуючым Чырвонай арміі. На другім кірунку дзейнічаў першы Менскі рэвалюцыйны атрад, пад маім камандаваньнем, уваходзіўшы да гэтага часу ў склад запасу другой арміі тав. Бэрзіна, які наступаў у гэты-ж час на Кіеў проці гайдамакаў.

Польскі корпус пачуў небясьпеку і рашыў па чарзе разграміць абодвы кірункі. Першы яго ўдар рушыўся на Жлобін. Уночы другая дывізія польскага корпусу зьняла ўсю варту чырвонагвардзейцаў і падышла да станцыі Жлобін, дзе ў гэты час у эшалёнах знаходзіліся чырвонагвардзейскія атрады. Раніцою 25 сьнежня 1917 г. разгарэлася гарачая бойка, пераходзіўшая ня раз у штыкавыя схваткі. Вельмі добра змагаліся піцерскія чырвонагвардзейцы і салдаты 268-га палка; ня дрэнна дзейнічаў і чырвонагвардзейскі атрад тав. Розэнбэрга (пазьней загінуў на Туркестанскім фронце).

Палякаў удалося адкінуць ад чыгуначнай станцыі, але яны заселі ў самым г. Жлобіне. Пры дапамозе панцырных аўтамабіляў і ручных гранат у працягу 8-мігадзіннай бойі горад быў вызвален. Дапамагло нашай перамозе тое, што адзін з палкоў 2-й дывізіі, які абыходзіў левы флянг чырвонагвардзейцаў, быў удала абстраляны ў той час, калі ён падаваўся ў лес пры станцыі.

Пасьля гэтага разгрому 2-й дывізіі распачаліся апэрацыі проці 1-й дывізіі таго-ж польскага корпусу. Яна абараняла гор. Рагачоў. Тав. Вацятыс уночы ўдала абкружыў горад і пад прыкрыцьцем моцнага артылерыйскага агню атакаваў палякаў і прымусіў іх адступіць да Бабруйску. На жаль, у некаторых атрадаў у той пэрыяд наглядалася вялікае імкненьне да самастойнасьці: так, жлобінскі атрад, замест таго, каб кінуцца ў тыл адступаўшым ад Рагачова палякам, бязьдзейнічаў і займаўся ўнутранымі справамі. Палякам удалося сьцягнуць рэшты 1-й і 2-й дывізіі ў Бабруйск, куды затым падышла і 3-я дывізія таго-ж корпусу з райёну Смаленска. Чырвоныя рашылі было перайсьці ў наступ на Бабруйск, але распачалася нямецкая акупацыя і пад націскам нямецкага войска чырвонагвардзейцы вызвалілі ўвесь гэты райён.

Усё-ж такі бойкі проці польскага корпусу ня мінулі дарэмна. Зьявіўся першы сур'ёзны баявы вопыт, склаліся першыя кадры, з якіх пазьней стварылася некалькі чырвонаармейскіх дывізій і, што самае галоўнае, былі сарваны пляны Антанты скінуць савецкую ўладу пры дапамозе паўстаньняў рэштаў старой арміі, вылучаных пад рознымі нацыянальнымі лёзунгамі.

Далейшы лёс польскіх легіянэраў быў вельмі сумны; іх разброілі немцы, а пасьля гэтага яны прабраліся да сябе на бацькаўшчыну. Зараз у Польшчы група Доўбар-Мусьніцкага не карыстаецца асаблівым давер'ем у Пілсудзкага.

Жыхарства-ж Магілеўскага і Бабруйскага райёнаў да гэтага часу, як відаць, добра яшчэ памятае тыя рэбункі і рэквізіцыі, якімі праславіліся польскія легіянэры.

С. М. Бяліцкі.

II усебеларускі зьезд МОПР'у

Шчырае прывітаньне барацьбітом за рэвалюцыю ў капіталістычных краінах.

28-га студзеня вечарам у Цэнтральным Доме Працасьветы адбыўся II усебеларускі зьезд МОПР'у.

Адчыняючы зьезд, тав. Славінскі ў сакавітых фарбах абмаляваў усю жудаснасьць становішча барацьбітоў за рэвалюцыю, якія ўкінуты ў капіталістычныя засьценкі.

— У Польшчы,—кажа тав. Славінскі,—штодня ўкідаюцца за краты вінскі,—штодня ўкідаюцца за краты сяткі лепшых таварышоў. Утвараюцца праэсы, у якіх ёсьць па 100—400 абвінавачаных за анты-панскую дзейнасьць. У Кітаі сотнямі скачваюцца насьць. У Кітаі сотнямі скачваюцца галовы рабочых і сялян. Буржуазея ўсяго сьвету захлёбваецца крывёю працоўных.

У гэты час мы павінны класьці ўсе сілы, усю энэргію, каб дапамагчы нашым братом і каб аблягчыць іх мучэньне.

Па скančэньні прамовы тав. Славінскага **на трыбуну пашлі дзесяткі дэлегацый ад розных прадпрыёмстваў і ўстаноў з прывітаньнямі, падарункамі і афярамі на карысьць зьняволеных.**

Рабочы ад дражджавога заводу «Варшавянка» прынёс ад імя завадзкога калектыву 42 руб.; жоны рабочых-чыгуначнікаў з Віцебску палажылі на стол прэзыдыуму некалькі тузінаў сарочак; нейкая жанчына прац скаецца праз залю ў прэзыдыум—просіць перадаць тав. Ланцуцкаму прыгожую вышываную рубашку; работніца заводу «Пралетары» перадала 60 руб. ад імя 120 рабочых; з Аршаншчыны прыслалі партрэт тав. Леніна, зроблены з кахлянага матар'ялу, і інш.

Падарункаў шмат. Іх трудна пералічыць. Кожны стараецца што-небудзь палажыць на стол, хоць чым-небудзь дапамагчы, а калі ня можа дапамагчы матар'яльна, дык перадасьць хаця ліст да другіх таварышоў.

Па першаму пытаньню зрабіў даклад тав. Сянкевіч.

(Працяг у чарговым нумары).

С. Азерскі.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Узмацненьне калектыўных гаспадарак.

Гомель, Справаздачна-перавыбарчая кампанія ў калгасах округі набліжаецца да канца.

Акруговая сэкцыя калгасаў адзначае шырокі ўдзел мясцовых савецкіх і партыйных органаў у гэтай працы: на справаздачных сходах калектываў удзельнічаюць прадстаўнікі райвыканкому, сельсаветаў, камітэтаў узаемадапамогі і шмат дзе сялянскі актыў.

Павялічаную актыўнасьць паказалі ў бягучую кампанію жанчыны—члены калгасаў, дзейна абгаварваючы арганізацыйныя, гаспадарчыя і бытавыя пытаньні свайго калектыву; колькасьць жанчын, абраных у праўленьні і рэвізійныя камісіі калгасаў, у паасобных гаспадарках хістаецца ад 20 да 40 проц.

Амаль на ўсіх справаздачных сходах выносіліся пастановы аб поўным абагуленьні існуючай яшчэ індывідуальнай жывёлы і інвэнтару.

Адначасова з правядзеньнем справаздачна-перавыбарчага сходу ў кожным калгасе інструктары Палессельсаюзу распрацоўвалі вытворчую праграму гаспадаркі на 1928 год. Пасьля абгаварэньня на агульным сходзе калектыву гэтая праграма зацьвярджалася і пасьля гэтага зьяўляецца ўжо абавязковай да выкананьня. Вытворчая праграма прадугледжвае ўвязку асобных галін гаспадаркі, надаючы ёй у цэлым спэцыяльны ўхіл, і крэдытаваньне калгасаў, у зьвязку з гэтым будзе выплываць з мерапрыёмстваў прадугледжаных гэтай праграмай.

Да гэтага часу ў большасьці калгасаў членам-пайшчыкам калектыву зьяўляўся толькі старшы ў сям'і.

У справаздачна-перавыбарчую кампанію ўсе гаспадаркі перайшлі на працоўнае членства: членамі калектыву лічацца ўсе асобы ад 18 гадоў, якія працуюць у гаспадарцы.

Усе калгасы будуць цяпер адлічваць 5 проц. ад умоўна чыстага прыбытку гаспадаркі ў непадзельны капітал калектыву.

Вучотная праца ва ўсіх калгасах значна ўпарадкавана. Ва ўсіх калектывах уводзіцца адналтойная спрошчаная сыстэма рахункаводзтва і справаздачнасьці, і ўсе калгасы для гэтага забясьпечаны адпаведнымі кнігамі і ім дадзены інструкцыі па рахункаводзтву і справаздачнасьці.

З.

Узрост актыўнасьці беднаты.

Слуцак. У студзені закончыліся перавыбары гарадзкога к-ту ўзаемадапамогі. Вынікі гэтай кампаніі паказваюць значны ўзрост актыўнасьці гарадзкой беднаты і зацікаўленасьць працай камітэту.

Па гораду праведзена 8 перавыбарчых сходаў, на якіх прысутнічала 477 асоб, або 47 проц. агульнага ліку членаў камітэту.

Па дакладу аб працы камітэту наглядаліся дзеславыя спрэчкі і прапановы; на некаторых сходах у спрэчках выступала па 15-20 асоб.

Значна палепшыўся супроць мінулага году якасны склад к-ту.

У склад прэзыдыуму новага камітэту абраны 2 партыйцы і 1 жанчына.

Наогул, выбарчая кампанія прайшла пад знакам узьняцьця актыўнасьці і зацікаўленасьці насельніцтва. Можна быць упэўненым, што пастаўленыя задачы дапамогі беднаце новым к-там будуць выкананы поўнасьцю. **П. Л.**

15000 РУБ. У ФОНД БЕДНАТЫ.

Мазыр, 28-1. Гэтымі днямі атрымана з Менску мясцовым акруговым с.-г. крэдытным т-вам 15000 р. спэцыяльна на крэдытаваньне бядняцкіх гаспадарак. Беднаце будзе адпускацца крэдыт па ільготных умовах.

СПРАВА ХУЛІГАНАЎ-БАНДЫТАЎ.

Гомель, 27-і. Скончылася сьледзтва і перадана ў суд справа чатырох хуліганаў з прыгародняй вёскі Любны, якія, некалькі месяцаў назад, напалі ў Гомелі з нажамі на рабочых чыгуначнага мосту. Адзін з рабочых Базыль Кашкароў быў забіты; двое другіх—цяжка паранены.

Рабочыя глыбока абураны гэтым хуліганскім учынкам і патрабуюць сурова пакараць вінаватых.

Абвінавачаным інкрымінуецца 76 артыкул Крымінальнага Кодэксу (бандытызм).

АРЦЕЛЬ ТРЫКАТАЖНІЦ.

Магілеў, 27-1. Акруговы прамысловы саюз арганізаваў у Магілеве арцель жанчын-работніц па вырабу панчох і трыкатажных рэчаў. Вырабы арцелі разыходзяцца праз кааперацыйныя арганізацыі.

РЭДКІ ПАРК.

Гомель, 27-і. У савхозе Барысаўчына, Хойніцкага райёну, знаходзіцца стары абшарніцкі парк, у якім маюцца такія дравы, як «туя» (якая расьце толькі ў Японіі і Кітаі), „сібірская елка“, „серабрыстая елка“, „казацкі пад'ядловец“ і інш.

Па заяве спэцыялістаў акрэсмаддзелу, гэтк-ж парк у СССР маецца толькі пры Цімірязеўскай сельска-гаспадарчай акадэміі.

Гэты парк у савгаспадарцы вырубаецца, і ў сучасны момант засталася толькі трэцяя частка яго.

Узьнімаецца хадайніцтва перад акрэсмаддзелам аб перадачы гэтага парку на навуковы заказьнік.

Дробязі культурнай рэвалюцыі.

Пытаньні культуры быту ў агульнай сыстэме культурнай рэвалюцыі займаюць досыць важнае месца. Культура быту зусім слушна закранае пытаньні ня толькі хатняга, індывідуальнага характару, але ў значнай меры і агульна-грамадзкія, там інтарэсы індывідуума сустракаюцца з інтарэсамі калектыву. І вось, асабліва тут, мы адзначаем яшчэ нашу некультурнасьць, неахайнасьць да сябе і да сваіх таварышоў.

Ленінскія дні гэтага году далі нам шмат, вельмі шмат матар'ялу для таго, каб на падставе іх зрабіць некаторыя вывады.

* * *

Адзін таварыш атрымаў ад гарадзкога камітэту партыі пуцёўку—21 студзеня а 7 гадзіне ўвечары зрабіць у клюбе камунальнікаў даклад «Чатыры гады Леніна».

Аб культурнай рэвалюцыі ў нас гавораць шмат. Но гэтыя разгаворы яшчэ не дайшлі да рабочых і сялян, але загадчыкі клюбаў, культаддзелаў, старшыні кіраўніцтваў прафсаюзаў паўна аб іх ужо ведаюць. Здавалася, што каб кіраўніцтва клюбу загадзя павяло сярод сяброў саюзаў агітацыю прыблізна наступнага зьместу:

— Таварышы! узяліся мы выконваць ленінскія заветы? Чаму аб культкультурнай рэвалюцыі забыліся? Давайце сход прысьвечаны памяці Леніна адчынім якраз у назначаны час. З ленінскага дню прыклад пачнём усім даваць і г. д.,—тады сход сабраўся-б у свой час. На гэтай практыцы можна было-б другіх выхоўваць і яе прытрымлівацца на далейшы час.

Ідучы на сход, дакладчык прыблізна так і разважаў.

— Ня можа-ж быць, каб гэты сход быў падобны і да іншых.

Але як моцна ён быў расчараваны, калі прышоў на сход роўна а 7 гадзіне, а заля, дзе сход павінен быў сабрацца, была яшчэ зачынена. Ні загадчыка клюбу, ні прадстаўніка прафсаюзу нікога няма. А «масы»? 5-8 чалавек швэндаецца на калідоры, а 10-15 сядзяць у чытальні. Заглядаю ў так званую бібліятэку, і там ніякага напаміну аб ленінскім дню.

Нічога яму не засталося як сесьці і чакаць. А 7 з палов. гадз. дзьверы залі былі адчынены і кантралёр стаў на сваім пасту. 8-10 асоб увайшлі ў залю. Навошта доўга аб гэтым пісаць—сход быў пачаты роўна а 9 гадзіне. Пытаецца дакладчык—чаму? Аказваецца, што яшчэ лёзунгі не напісаны, клюб не пасьнеў падрыхтавацца і г.д. Пытаецца далей,—а падрыхтоўчыя пасяджэньні, нарады, дырэктывы, пастановы аб правядзеньні ленінскага сходу былі? Як-жаж, усё было. Не дарма-ж больш чым тры дзесяткі чалавек ва ўсіх гэтых пасяджэньнях удзел прымалі!

Скажуць, што гэта дробязь, ня варта гаварыць. Не, на гэта згадзіцца ніяк ня можна. У справе пасяджэньня культуры нашы клюбы павінны адыгрываць найважнейшую ролю. Ім, як кажуць, карты ў рукі. Хто-ж бліжэй сутыкаецца з рабочым па культурным фронце, чым не яны? На каго ўскладзен гэты абавязак? Уся наша вытворчая прапаганда, наогул, уся праца па навучаньню рабочых культурна аднесьціся да інтарэсаў грамады ня дасьць належнага плёну, як ня зможам упяршыню іх выхоўваць на дробязях, на асобных прыкладах і фактах.

І яшчэ: асобы і ўстановы, якія павінны прыклад паказаць, на вялікі жаль, самі далёка ў гэтай справе адстаюць. За прыкладам бегчы ня трэба.

Юбілейная сэсія ЦВК СССР у Ленінградзе, якая павінна была пачацца «роўна а 2 гадзіне», пачала працаваць акуратна а 2 гадз. 41 хвіл.

Другая сэсія ЦВК БССР, якая павінна была пачацца «роўна а 6 гадз.», пачала працаваць роўна а 6 гадз. 45 хвіл., а між іншым кіраўнікі ўсіх дэлегацый былі загадзя паведамлены, што абавязкова трэба роўна ў вызначаны час адчыняць.

Тры таварыны былі гэтымі днямі выкліканы ў партыйны камітэт на пасяджэньне, якое павінна было цягнуцца роўна 15 хвілін. Пакуль прышоў кіраўнік гэтага пасяджэньня яны чакалі 1 гад. і 45 хвіл. Мы ўжо тут не гаворым аб тым, што сходы ячэек заўсёды пачынаюць са спазьненьнем на гадзіну, а часам і яшчэ больш, і што ў нас ужо ў прыказку ўвайшло, што кожны дакладчык, які сябе толькі паважае, павінен спазьніцца на сход ня менш чым на паўгадзіны.

Ці вось уявіце сабе такі факт: адзін таварыш атрымаў ад гаррайкому прапанову зрабіць на заводзе «Беларусь» даклад аб Леніне. У 7 з пал. гадз. у гэтага таварыша было яшчэ адно пасяджэньне, на якім яму абавязкова трэба было быць.

Разважаў ён гэтак: сход па заводзе «Беларусь» а 5 з палов. гадз., у райкоме разлі прыйсьці а 6 гадз., тады ўсе пэўна ўжо ў зборы будуць; гадзіну на даклад і змагу яшчэ адпачыць да пачатку пасяджэньня. Але ня так яно робіцца, як бяецца. Гэты прыйшоў а 6-й гадзіне, сядзеў да 7 г. 10 хв., калі ўрэшце пры напалову пустой залі яму далі слова для дакладу. Даклад, зразумела быў скомканы, бо ў 15 хв. ніяк уклаціся ня можна было, а прамоўца сьпішаўся на другі сход.

Чаму нас падобны факт вучыць? Наша некультурнасьць не дае нам матчымасьці плянава будаваць свае жыцьцё, а адсюль і правільна весьці сваю гаспадарку. А між іншым ніякіх патуг нават і ня трэба для таго, каб гэткіх выпадкаў было ўсё менш ды менш.

* * *

Факт другога гатунку. На 20 студзеня быў назначаны сход моладзі Нарпіту з дакладам на тэму «Ленін і моладзь». Дакладчык загадзя атрымаў пуцёўку. У дзень дакладу прамоўцу паведамілі, што сход будзе не 20, а 22 студзеня ў ленінскім кутку ў сталоўцы № 6 а 7 гадзіне ўвечары. Здавалася ўсё добра: дакладчык ёсьць, час вызначан, памяшканьне як след абсталявана, большага здаецца і ня трэба.

Дакладчык, навучаны горкім вопытам, прыйшоў на сходзе не 7, а 7 з пал. гадзіне, і зразумела, застаў толькі 3—4 чал. Памяшканьне, відаць, было дэкаравана з вялікай любоўю, бо адразу ўваходзячы туды адчувалася, што сёньня сапраўды жалобны дзень, што тут здорава шануюць памяць правадыра. Гэта толькі спачатку, а праз 10 хвілін зьяўляецца адміністратар сталовай з афіцыянтамі, здымаюць са сталоў чырвоныя настольнікі, паклаці дошкі для вялікага стала, адным словам уся гэтая жалобная ўрачыстасьць у працягу аднэй хвіліны зьнікла. Пытаюся—чаму? Аказваецца, што нехта наладжвае банкет і адміністрацыя ім адвяла пакой ленінскага кутка.

Тут, зразумела, нас цікавяць два пытаньні: няўжо-ж гэтыя «банкецёры» не змаглі абраць для банкету іншы дзень апроч жалобнага Ленінскага дню? Няўжо-ж адміністрацыя сталоўкі не змагла для гэтага абраць іншы пакой і даць рабочым магчымасьць правесьці Ленінскі дзень у Ленінскім кутку? Асабліва зьвярнула нашую ўвагу тое, што ніхто з сабраўшыхся на сход нават ня ўсьпяў пытаньня аб гэтым. Гэты пячэты, нязтычны, каб не казаць больш, учынак адміністрацыі быў успрыняты як нешта павінае, нармальнае і бясспрэч ве. Вось што нас асабліва зьдзівіла. Няўжо-ж можна прайсьці міма такіх выпадкаў?

* * *

Мы прызвычаіліся мець дачыненьне з вялікімі лічбамі—з міліёнамі, міліярдамі.

Мы ня хочам быць «спрытнымі» матэматыкамі. Усё-ж калі мы падлічым, колькі міліёнаў гадзін штомесячна рэгулярна траціцца на спазьненьні, на чаканьні, на нашу неакуратнасьць, расхлябанасьць, то лічбы будуць вялізныя, нечаканыя, якія могуць зьдзівіць хоць каго...

* * *

...— Дакладчык выклаў тэмп і мэты індустрыялізацыі на Захадзе, у капіталістычных і калёніяльных краінах і Савецкім Саюзе. Капіталіст

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Першыя крокі ў рэалізацыі пазыкі.

(Лист з Бабруйску).

Падрыхтоўчая праца да рэалізацыі пазыкі ўмацненьня сялянскай гаспадаркі скончана.

Зараз праводзіцца рэалізацыя самой пазыкі. Выдзелен кадр працаўнікоў для правядзеньня кампаніі па растлумачэньню сярод сялянства мэты і значэньня пазыкі. Амаль што ў кожнай вёсцы праводзяцца сялянскія сходы аб пазыцы. Сялянства кажа, што пазыка —справа добрая, і яе неабходна купіць кожнаму селяніну. Аб гэтым сьведчаць такія факты: па 17 сходах сялян, якія праведзены былі па Берасьнёўскім і Баравіцкім сельсаветах, сяляне пастанавілі купіць аблігацыі пазыкі. Пленум Берасьнёўскага сельсавету адзінагалосна пастанавіў усім сябрам сельсавету падпісацца на пазыку. Пры правядзеньні сходаў у вёсцы Камарова падпісалася 8 сялян і ў в. Віленка 4.

Бядняцкія групы бяруць на сябе абавязкі агенту па распаўсюджаньні пазыкі. Сьвечкаўская арцель возчыкаў у ліку 57 асоб пастанавіла кожнаму сябру арцелі купіць пяцірублёвую аблігацыю.

Для больш шырокага распаўсюджаньня пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі па акрузе арганізавана контрагенцкая і суб'агенцкая сець. У Бабруйску на рынку ўстанаўляецца спэцыяльны кіёск для продажу аблігацый пазыкі. Аблігацыі прадаюцца ў Сельбанку, у Доме Селяніна, у Акрэа, у таварыствах, Цэрабкопе, Хлебапрадукце і іншых арганізацыях. Шафтаварыствы ў парадку шэфпрацы праводзяць кампанію за падпіску на пазыку. Прыняты крокі да рэалізацыі пазыкі сярод чырвонаармейцаў.

Акругком камсамолу абвясьціў конкурс на лепшага распаўсюджвацеля аблігацый пазыкі, у вёску накіраваны дылпазытывы аб сялянскай пазыцы.

Ужо паступаюць весткі аб падпісцы на пазыку. Па няпоўных вестках за апошнія дні мы маем наступныя лічбы рэалізацыі пазыкі: у Клічаўскім раёне рэалізавана 800 рублёў, у Жлобінскім 50 р., у Глускім—370 руб., у Бабруйскім—117 і Парыцкім—1110 р.

А. Дамброўскі.

Рэалізавана на 13.500 руб.

(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта)

БАБРУЙСК, 28-I. Кампанія па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі па акрузе разгортваецца.

Сяляне выказваюцца за дапамогу дзяржаве ў справе распаўсюджаньня аблігацый пазыкі. Па няпоўных вестках, па Клічаўскаму раёну распаўсюджана на 800 руб. аблігацый, па Глускаму—на 370 р., па Бабруйскаму—117 р., Парычы—1.110 р., Слуцак—5.000 р., Асіповічы—6.000 руб.

КОЖНЫ ЧЛЕН КАМІТЭТУ УЗАЕМАДАПАМОГІ ПАВІНЕН ПАДПІСАЦЦА НА ПАЗЫКУ.

ГОМЕЛЬ (Ул. кар.). Райённыя зьезды камітэтаў узаемадапамогі ў Ветцы, Уваравічах і Церахоўцы пастанавілі, што кожны член камітэту ўзаемадапамогі павінен пэрсанальна набыць аблігацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі.

Апроч таго, камітэты павінны частку сваіх грашовых фондаў укласьці ў аблігацыі пазыкі.

КУПІЛІ АБЛІГАЦЫЙ ПАЗЫКІ НА 1840 РУБ.

БАБРУЙСК. (Ул. кар.). Паступілі першыя весткі аб рэалізацыі пазыкі. Клічаў прадаў аблігацый на 800 руб., Жлобін—на 511 руб., Глуск—на 372 руб. і Бабруйскі раён—на 157 руб.

ПАДПІСАЛІСЯ НА 152 Р. 50 К.

МАЗЫР. (Уласн. кар.). Пры правядзеньні сходаў упаўнаважаных сельска-гаспадарчай каапэрацыі па Лельчыцкім і Буйнавіцкім таварыствах ставіліся даклады аб пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі. У сваіх выступленьнях сяляне казалі:

— Чакаць пазык ад буржуяў ня трэба: рабочая кляса падпісалася на пазыку індустрыялізацыі, а мы, сяляне, падпішамся на сваю пазыку, і будзем разам будаваць сваю савецкую краіну.

Упаўнаважаныя Буйкавіцкага таварыства падпісаліся на 125 рублёў, а Лельчыцкае таварыства на 27 р. 50 к.

У падпісцы на пазыку вельмі актыўную ролю адыгрываюць серадняки.

2500 руб. у кацёл укінулі.

У савгасе Дайнічава, Бабруйскай акругі, быў патрэбны стары кацёл. Кожнаму, хто ні гляне, былі відны выпучыны на катле, але Белсельтраст, мусіць, палічыў: «што там выпучыны, калі дзірку і то можна грашыма залатаць». Вось і парашылі перакінуць кацёл у савгас Межава, Аршанскай акругі... недалёка. Ну і...кінулі 2500 руб. і перакінулі. Тады толькі хапіліся выклікаць тэхнічнага інспэктара, які знайшоў, што, апрача выпучын, на катле ёсьць яшчэ і раковіны, і што без капітальнага рамонту (калі будзе магчымасьць яго выканаць) можа часова і можна будзе працаваць.

Рамонт ці ўдасца, а каштаваць будзе разам з перавозкай і іншымі выдаткамі столькі сама, як і новы кацёл. Ну і пачалі грошы выпучыну ў ў паравым катле ды на марозе назад заганяць. Выпучыну пакуль што не загналі, а аднаго кацельшчыка той сьвет адправілі: учадзеў пры рабоце, дзень пажыў і памёр.

Сказаць, што за навуку грошы плацяць, за навуку людзі гінуць,—нельга, бо навука ўжо была і ня мала каштавала, і таксама з паравым катлом, які ў свой час перакінулі ў савгас Косіна ранейшай Барысаўскай акругі. Маркуючы пусьціць бровар, грошы пусьцілі на вецер, а кацёл аказаўся нездатным, і прымушаны былі купіць другі.

Уся бяда ў тым, што ў Белсельтрэсьце завёўся бюракратызм, і замест таго, каб яго сьцерагчыся,—на старыя памылкі бяцца глянуць, ну, а дыректарам няма калі, бо яны ўвесь час у камандыроўках знаходзяцца. Каб запытацца, ці ня лепш было-б кацёл выпрабаваць на месцы ў Дайнічаве, дык, мусіць, ня будуць ведаць, што і адказаць. Калі-ж на тое пайшло, дык трэба сказаць, што з пускам бровару ў Межаве, калі ня было катла, можна было яшчэ ўстрымацца, бо побач за 8 вёрст у савгасе Высокае бровар працуе і бульбу ёсьць куды дзець. Але бюракратам хоць трэсьні, а дзяржы фасон, бо на пляну намечана пусьціць бровар. А зьнішчэньне бюракратызму і рэжым эканоміі да іх не датычыцца.

Прыблуда.

ЯК ІДУЦЬ ЗАГАТОЎКІ ЭКСПОРТНАЕ СЫРАВІНЫ.

У загатоўках экспортнае сыравіны ёсьць яшчэ недарэчнасьці.—Трэба зьнішчыць канкурэнцыю паміж загатоўцамі.

Канкурэнцыю трэба зьнішчыць

Паводле даных Белдзяржгандлю, за 15 дзён студзеня ў Віцебшчыне, Гомельшчыне Бабруйшчыне і Аршаншчыне сыстэмай Белдзяржгандлю загатоўлена ільнянага семя 48 тон, валакна лёну—224,5 тон, пянькі 8 тон, шчаціны—15 тон, пушніны—на 53.000 руб., смалы—120 тон, рызьзя—41 тона, шпігінару—20 тон і г. д. Разам з тым загатоўлена розная другарадная дробная экспортная сыравіны на 25.200 руб.

Трэба адзначыць, што асабліва пералому ў галіне загатовак пакуль што не заўважваецца. Магчыма, гэта можна тлумачыць тым, што нізавая сетка дала яшчэ далёка няпоўныя зьвесткі, ды яно на справе так і ёсьць.

Дагэтуль яшчэ ня зьнішчана нездаровая канкурэнцыя паміж рознымі загатоўчымі арганізацыямі, прычым апошнія спрабуюць адзін аднаго падлавіць. К прыкладу, у Бярэзінскім раёне (Меншчына) Бярэзінскае спажывецкае таварыства выдзеліла частку пушніны і надаслала яе для продажу агенту Белдзяржгандлю, а той заплаціў на 10 проц. даражэй, чым належала. Наогул, гэта выпадак сьведчыць аб хворых адносінах паміж загатоўцамі. Назіраюцца выпадкі, калі у пагоне за сыравінай загатоўцы падвышаюць цэны, але на мясцох ужо з гэтым вядзецца барацьба.

Трэба таксама адзначыць, што некаторыя райвыканкомы адносяцца адмоўна да карабейнікаў і не даюць ім магчымасьці працаваць (Бярэзінскі раён). Наадварот, гэтых карабейнікаў нам трэба выкарыстаць як мага паўней, але толькі іх трэба паставіць пад кантроль мясцовых арганізацый, каб карабейнік не працаваў на прыватніка.

Экспорт кішачных вырабаў наладжваецца.

Загатоўка кішак, страўнікаў і іншых аналёгічных відаў у даваенны час была значна разьвіта. Гэтыя тавары вывозіліся заграніцу ў вялікіх разьмерах.

У 1923-24 годзе Белдзяржгандаль пачаў загатаўляць цялячыя страўнікі і ў невялікай колькасьці вывозіў іх заграніцу. Мала цікавілася гэтымі таварамі каапэрацыя, але Кішпрамгандаль у апошнія два гады разгарнуў вялікую дзейнасьць у данай галіне.

Але і тут былі ненармальнасьці: загатаўляў Белдзяржгандаль, а з ім канкураваў Кішпрамгандаль (кантора управы Дзяржаўнага Гандлю РСФСР); у выніку—недарэчнасьці. З цэнтру ўказвалі, што Белдзяржгандаль павінен перадаць свае загатоўкі Кішпрамгандлю, а Белдзяржгандаль заляўляў, што ён самастойна можа экспартаваць гэты тавар. Словам, ствараліся такія ўмовы, пры якіх цяжка было нармальна і прадукцыйна весьці загатоўкі.

І вось зараз (лепш позна, чым ніколі) абедзьве гэтыя ўстановы—Белдзяржгандаль і Кішпрамгандаль—задумалі добрую справу—працаваць разам.

Пасьля доўгіх нарад, урэшце, прыйшлі да згоды: паміж Белдзяржгандлем і Кішпрамгандлем падпісан дагавор; у выніку распачалася прадукцыйная праца.

Кішачная прамысловасьць у Беларусі мае шырокае поле дзейнасьці; можна вельмі шырока разьвіць гэтую справу і экспартаваць вялікую колькасьць гэтых вырабаў.

Белдзяржгандлю і Кішпрамгандлю трэба зараз актыўна і дружна ўзяцца за загатоўку і экспорт гэтых тавараў.

скі.

Прамтавары для прэміраваньня за экспортную сыравіну.

ВІЦЕБСК. (Ул. кар.). Пры сельсаюзе ўтворан спэцыяльны фонд дэфіцытных тавараў для прэміраваньня нізавой каапэрацыі за ўзмоцненыя загатоўкі.

Зараз у фонд прамтавараў паступіла 100 замежных саломарэзак. Саломарэзкі будуць перададзены нізавым с.-г. каапэратывам для продажу выключна тым, што здаюць экспортную сыравіну.

У гэты фонд паступіла ўжо 10.000 пуд. жыта. Жыта будзе накіравана непасрэдна ў райёны для прэміраваньня здатчыкаў лёну.

ЗАГАТОЎКІ Ў БАБРУЙШЧЫНЕ.

(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

БАБРУЙСК, 28-I. За 5-ю пяцідзёўку студзеня адстаўшыя па загатоўках райёны памалу падцягваюцца, але побач з гэтым зазначаецца паслабленьне ходу загатовак у райёнах Глускім і Рагачоўскім.

Па Жлобінскім райёне апошняя 5-ціднёўка дала павялічэньне амаль на 100 проц.

Падцягнуўся па загатоўках і Бабруйскі райён, які за 5-ю пяцідзёўку даў 33 тоны хлебапрадуктаў.

Па агульнаму становішчу хлебазагатоўкі за 5-ю пяцідзёўку пазніліся. Так, напр., за 4-ю пяцідзёўку было загатавана 27.450 пуд., а за 5-ю толькі 18.398 пуд.

Слуцак за апошнія 5 дзен даў памяншэньне амаль на 50 проц. Паслабленьне загатовак тлумачыцца тым, што хлеб прыходзіцца загатаўляць дробнымі часткамі ў сялянства.

У СТУДЗЕНІ БЕЛДЗЯРЖГАНДАЛЬ ЭКСПАРТАВАЎ НА 350.000 РУБ. СЫРАВІНЫ.

Паводле няпоўных даных, за 21 дзень студзеня Белдзяржгандаль экспартаваў рознай сыравіны на суму звыш 350.000 руб. Паміж іншым, экспартавана 8186 пуд. ільнянага валакна, 488 пуд. пянькі, 915 пуд. шчаціны, на 60.000 руб. грыбоў, на 33.000 р. пушніны і на 20.000 р. конскага воласу.

Цікава адзначыць, што ў студзені экспартаваны і новыя віды сыравіны: 3050 пуд. крахмалу, 793 пуды цыбулі, 610 пуд. мёду, 488 пуд. патакі і інш.

ВОРША, 28-I. Паводле апошніх даных, апаратам Белдзяржгандлю ў Аршаншчыне і Магілеўшчыне ў студзені загатоўлена для экспорту ільнянага валакна 4758 пуд., ільнянага семя 793 пуды, пянькі і шчаціны па 42 пуд., пушніны на 15.000 руб., смалы—3782 пуд., мёду каля 800 пуд., рызьзя—1220 пуд. і іншай сыравіны—на 3200 руб.

„Гегемоністы".

Адным з самых рэпрэзэнтабельных відаў экспортных тавараў зьяўляецца наша беларуская пушніна. Як вядома, на гэты від экспорту шмат „паляўнічых" (апроч Беларускага паляўнічага саюзу...). За адной вавёркай ганяюцца 5 загатоўцаў, вакол адной лісічкі круцяцца 25 агентаў (па 5 агентаў ад кожнай арганізацыі...) Ясна, што пры гэткіх умовах ніводная арганізацыя ня зможа выканаць, як сьлец, свайго пляну. На рынку існаваў ажыятаж, практыкавалася яўнае і скрытае павялічэньне цэн, і пакуль усе загатоўцы ня былі аштрафаваны на досыць буйныя сумы (па 1000 р.), на пушным рынку ня было парадку.

Але адзін з загатоўцаў—Беларускія паляўнічыя саюзы на мясцох—не супакоіўся. Ён надумаў спосаб, як замацаваць за сабой „гегемонію" на тэрыторыі Беларусі і стаць „мандапалістам" на пушным рынку. Гэты загатоўца выдаў дырэктыву, што „кожны паляўнічы, які ня здасьць пушніны у саюз, пазбаўляецца назвы члена саюзу; у яго адбіраюць стрэльбу і не дазваляюць весьці паляваньне на зьвяроў».

Вось гэткая суровая і недапушчальная дырэктыва была дадзена ўсім паляўнічым.

Рэшта загатоўцаў ахнулі, занарушыліся...

— Што-ж гэта будзе? Гэта трэба зразумець так: складзі, братва, зброю, адмоўся ад загатоўкі пушніны і ўсё перадай „гегемоністу"—Беларускаму паляўнічаму саюзу.

Добра, што за гэтым сачаць пашы рэгулюючыя органы, і адночы Наркамгандаль БССР у вельмі далікатнай форме заявіў гэтым зарваўшымся загатоўцам, што ў выпадку паўтарэньня такіх трукаў, у адносінах да вінаватых будуць ужыты меры, пасьля якіх ім самім прыдзецца адмовіцца ад доўгі вавёрак і харкоў.

Добра тое, што добра канчаецца, але трэба адгэтуль зрабіць вывад, што кожны загатоўца шукае спосабу, каб усякімі законнымі ці незаконнымі спосабамі «задушыць» свайго таварыша на працы. З гэткімі ненармальнымі зьявішчамі неабходна весьці бязьлітасную барацьбу дзеля поўнага аздараўленьня рынку, тым больш, калі ідзе гутарка аб загатоўцы такога „ласага кавалку", як пушніна.

Пушны рынак БССР павінен быць ахоплен поўнасьцю. Экспортны плян павінен быць выканан на ўсе 100 проц. Але загатоўчая праца павінна весьціся па намечаным Наркамгандлем пляну; павінна праходзіць у нармальных умовах; а гэткія мэтады працы, якія ўжывалі паляўнічыя саюзы на мясцох, шкодны і толькі зрываюць плянавую прадукцыйную працу.

Л. М.

ЗАГАТОЎКА РЫЗЬЗЯ.

Управа Белдзяржгандлю арганізуе ў Менску базу па перапрацоўцы рызьзя. Прадугледжваецца да загатоўкі і перапрацоўкі каля 60000 пудоў рызьзя ў год. На гэтай рабоце будзе занята каля 60-70 рабочых.

Да 60-гадовага юбілею Менскага т-ва дактароў.

Кастрычнік даў магчымасьць шырока разгарнуць працу.

(Гутарка з сэкратаром т-ва дактароў д-арм М. А. Полякам).

З 1917 да канца 1921 году таварыства дактароў працавала пры цяжкіх умовах. Таварыства зьмяшчалася пры дакторскай сэкцыі саюзу Мэдсанпрацы. Уся дзейнасьць выявілася толькі ў некалькіх навуковых дакладах.

У часе нямецкай і польскай акупацый таварыства дабівалася зацьверджаньня свайго статуту, але акупанты ставілі шэраг перашкод, і фактычна таварыства не існавала.

У канцы 1921 году быў зацьверджан статут таварыства, і першы сход адбыўся 5 студзеня 1922 г. Дзякуючы Савецкай уладзе, таварыства атрымала магчымасьць заняцца чыста навуковай працай. Прафэсыйныя-ж, этычныя і палітычныя пытаньні перайшлі ў орган аховы здароўя і сэкцыю Мэдсанпрацы. У 1922 г. таварыства налічвала каля 100 сяброў, зараз-жа ўсіх сяброў каля 150 чалавек. У ліку сяброў т-ства ёсьць адзін з заснавацеляў таварыства д р мэдыцыны Язэп Лазаравіч Лунц, які зьяўляецца гапаровым старшынёй таварыства.

У апошнія часы таварыства пачало наладжваць сувязь з месцамі. Так, нядаўна члены праўленьня выяжджалі ў Барысаў на адчыненьне навуковага мэдыцынскага гуртка.

Таварыства дактароў не засталося апалітычным: яно жыва рэагавала на ўсе палітычныя падзеі. Ніводная выступленьне нашых ворагаў, якое выклікала абурэньне ўсіх працоўных, не заставалася не адзначаным таварыствам дактароў; усе гэтыя гады сябры т-ва ішлі і ідуць поплеч з рабочымі і сялянамі.

Пажаданьні тав. Кнорына пры адраджэньні таварыства ў 1922 годзе, каб дактары, як частка інтэлігенцыі, былі культурнікамі і грамадзкімі працаўнікамі, ажыцьцёвілася.

Пажаданьне рэктара БДУ прафэсара Пічэты, каб навуковыя сілы таварыства ўліліся ў Унівэрсытэт і каб унівэрсытэтскія сілы зьвязаліся з таварыствам, выкананы на ўсе 100 процантаў.

Пажаданьні Наркамасьветы тав. Ігнатоўскага, каб навука падышла бліжэй да вёскі для барацьбы з цемрай, таксама многімі сябрамі таварыства ажыцьцёўлена.

У заключэньне неабходна сказаць, што, толькі дзякуючы Савецкаму ладу, навука, як выпушчаная з няволі птушка, шырока расправіла крылы і працуе на карысьць разьвіцьця пралетарскае культуры.

Першы год існаваньня таварыства дактароў.

Гутарка з доктарам мэдыцыны Я. Л. Лунцам.

Я прыехаў у Менск у лістападзе 1867 году, а першае пасяджэньне толькі што ўтворанага таварыства дактароў адбылося 1-га верасьня 67 г.

У таварыстве тады налічвалася толькі 15-16 чалавек, у тым ліку былі фармацэўты, вэтэрынарны доктар і адзін прыродазнаўца.

З самаго пачатку свайго існаваньня таварыства дактароў спаткала варожыя адносіны і злосныя нападкі з боку ультракансэрватыўнай газэты „Московские Ведомости". Рэдактар гэтай газэты, вядомы кансэрватар Каткоў, абвінавачваў таварыства ў палітычнай небясьпечнасьці, бо, па статуту апошняга, сябрамі маглі быць і прыродазнаўцы. Справа ў тым, што яшчэ ня шмат часу прайшло ад польскага паўстаньня, і Каткоў бояўся, што ў ліку прыродазнаўцаў огуць быць польскія абшарнікі.

Зразумела, што мясцовая жандармэрыя прыслухалася да таго, што гаварыць «Московские Ведомости», і ўстанавіла «слежку» за сябрамі таварыства. У гэтую справу ўмяшаўся прафэсар Пэкікан, які быў старшынёй мэдыцынскага дэпартаманту. У сваім артыкуле ён даказаў беспадстаўнасьць нападак Каткова і нават абвесьціў яго монаманам («мания преследования»).

У першыя гады існаваньня таварыства зьбіралася адзін раз у месяц. На сходах чыталіся рэфераты, і дактары дзяліліся цікавымі выпадкамі ў іх практыцы.

Ці патрэбен сельскі зямельны суд.

Зямельны суд трэба ўпарадкаваць.

Усім зразумела, што суд павінен быць паважанай установай. Але калі зрабіць так, як прапануе ў сваім артыкуле тав. В. («С. Б.» № 2), дык будзе не набліжэньне суду да сялянства, як ён думае, а зьмяншэньне аўтарытэту суду. Каб быць паважаным, судзьдзя павінен быць бесстаронным (хоць-жа і з клясавым падыходам да справы) і ведаць існуючыя законы, бо інакш ён будзе накіроўваць жыцьцё грамадзян не па новаму, па рэвалюцыйнаму шляху, як указвае Савецкая ўлада, а па свайму, часам і можа і пастарому. Тав. В. запамятаваў, што нашы сяляне яшчэ мала пісьменны, а то і зусім няпісьменны і часта жывуць яшчэ па тых звычаях, як жылі нашы дзяды. Вядома, што калі ў нашага селяніна завядзецца якая-небудзь судовая справа, дык ён часта яшчэ паспрабуе дамагацца ўплыву на судзьдзю пры дапамозе свайкоў альбо знаёмых. А вядома, што ў кожнага селяніна звычайна ёсьць сувязь амаль што ні са ўсёй вёскай: той яму сусед, той радня, з тым даўно знаём. У сучасны момант пры нашых умовах пакуль што яшчэ нельга чакаць, каб сябры нашых сельсаветаў былі добрымі судзьдзямі, тым больш, што пэнсіі за сваю працу ў якасьці судзьдзяў атрымліваць яны ня будуць.

Праўда, старшыня і сэкратар с-савету атрымліваюць па 28 руб. у месяц, але яны за гэтыя грошы маюць шмат іншай працы, судовая-ж праца будзе для іх звышмернай. Ёсьць зьявішчы, з якіх можна праканацца, што нашы сельсаветы яшчэ ня маюць досыць паважаных адносін да судовых спраў, напрыклад: у зямельных судовых справах бываюць нярэдкія выпадкі, калі бакі па аднэй і тэй-жа справе прыносяць у суд ад аднаго і таго-ж с-савету супярэчныя даведкі і пасьвядчэньні.

Тав. В. у сваім артыкуле інфармуе чытачоў, што процант абскарджаньняў рашэньняў зямельных камісій памяншаецца, але ён сам указвае, што процант адмены перавышае 40.

У Менскай акруговай зямельнай камісіі процант адмены рашэньняў раённых зямельных камісій даходзіць да 46,80, як бачым, амаль не палова рашэньняў адмяняецца. Але запраўды процант няправільных рашэньняў раённых зямельных камісій значна больш, бо іх адмяняе яшчэ і Асобая Калегія Вышэйшага Кантролю па зямельных справах у тых выпадках, калі бакі непасрэдна туды скардзяцца пасьля пропуску тэрміну абскарджаньня. Калі раённыя камісіі так кепска спраўляюцца са сваёй працай у якасьці першай інстанцыі, дык чаго-ж можна чакаць ад сельскіх судоў, якія прапануе тав. В? І хіба-ж раённыя камісіі ў якасьці касацыйных інстанцый будуць лепш працаваць, чым цяпер? Зразумела, што яны не могуць яшчэ быць касацыйнымі інстанцыямі; большасьць спраў будзе даходзіць да Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю, і такім чынам будзе не набліжэньне суду да насельніцтва, а будзе, па маёй думцы, павялічэньне судовае валакіты.

Мне здаецца, што калі-б раённую зямельную камісію выдзеліць з Райвыканкома ў асобную больш самастойную ўстанову, як гэта зроблена ў Акруговым Зямельным Аддзеле, дык тады яна магла-б часьцей выяжджаць у вёскі на месца спрэчак. Гэта і было-б запраўдным набліжэньнем суду да насельніцтва.

ЛІПНЕВІЧ ТОДАР.

(Селянін, член прэзыдыуму Менскага АВК).

Беларусізацыя навыварат.

У справе паглыбленьня і пашырэньня культурнай рэвалюцыі на вёсцы непараўнана вялікую ролю адыгрывае добра пастаўленая сялянская газэта. У нас, на Беларусі, гэткіх газэт налічваецца 8; з гэтых газэт найбольш прыстасаванаю для патрэбаў сялянства зьяўляецца «Беларуская вёска». Усе гэтыя газэты, апрача аднэй, ужо даўно пераведзены на беларускую мову, што павінна было-б аблягчыць газэце шлях у вёску. На наш погляд, справа беларусізацыі сялянскай газэты, як і справа ўдасканаленьня мовы ў сялянскай газэце, патрабавала і патрабуе самых уважлівых адносін, пазбаўленых ад усякай афіцыяльшчыны. І гэта вусім зразумела: чым больш зразумелая і жывая будзе мова газэты (мы не гаворым ужо пра тэхніку газэты) —тым глыбей яна здолее прабіцца ў вёску, тым большыя будуць выгоды ўсіх тых кампаній, якія праводзяцца ў газэце і г. д.

На вялікі жаль, ня ўсе і ня ўсюды сэпс беларусізацыі. У нашых дзелавых паперах, у нашых шыльдах, у друку і г. д. часамі нападаюцца такія дзікія мовы і звароты, што проста дзіву даешся, як таленавіта перадаюць нашы дзеловоды расейскія словы ў беларускай транскрыпцыі: бязумоўна, для вёскі такія словы будуць ня больш зразумелымі, чымся іх расейскія аўтэнтыкі.

Ня так даўно ў «Сав. Бел.» быў зьмешчаны артыкул пра культуру і мову бюракратызму. Там, на вялікі жаль, ня было праведзена паасобных прыкладаў з нашай сучаснай практыкі, але наогул, думка выказана правільная: сапраўды, наша канцэлярыя ў значнай меры яшчэ карыстаецца зваротамі старой дарэформенай канцэлярыі: нездарма-ж слова «цыркуляр» да гэтага часу служыць сынонімам сухасьці, мёртваслоўя і г. д.

Перанесьці практыку надуманых канцэлярскіх слоў у газэту—на наш погляд справа вельмі рызыкоўная. Але яшчэ больш адмоўным зьявішчам трэба лічыць тое, што вельмі часта і нашы газэтныя работнікі нядбайна адносяцца да таго, што яны пішуць, ня ўдумываюцца ў сэнс словаў і сказаў, і ў выніку выходзіць не сялянская газэта, а лішні пэрл канцэлярскай творчасьці. Сюды-ж трэба аднесьці і значны процант расейскіх, ці напалову расейскіх (і такія ёсьць!) слоў; і тэрміны і звароты, якія сьмела можна было-б замяніць на жывыя беларускія. Прыкладаў доўга шукаць ня трэба.

Перад намі — «Чырвонае Палесьсе» —орган Мазырскага АК КПБ і АВК.

Гэта штотыднёвая газэта ўжо ў загалоўку сваім піша так:

Падпісная плата каштуе...

Ці думае рэдакцыя, што азначае гэткі сказ? На наш погляд, ён азначае няпісьменнасьць яе і наўменьне пісаць і будаваць сказы набеларуску.

У № 1 «Ч. П.» у заметцы «папыраем падпіску па «Чырвонае Палесьсе» чытаем:

З сельскораў адгукнуліся Каратынскі, які сабраў 25 падпішчыкаў, Гарбацэвіч —13 падпішчыкаў, Белы—9, Лапета—7. Усе апошнія сельскоры. Падпісную кампанію абмінулі нягледзячы, што былі разасланы падпісныя лісты.

Аднясём кропку пасьля слова «сельскоры» на кошт карэктуры, бо інакш будзе зусім бязглузьдзіца, селянін толькі дагадаецца, пра што тут гаворыцца, бо ўсякія карэктурныя і друкарскія магчымасьці яму невядомы. Але сэнс усяго сказу, дзякуючы няправільна ўжытаму слову «апошнія», зводзіцца да таго, што пералічаныя сельскоры, хоць і сабралі падпіску, але падпісную кампанію праваліли, «пагледзячы, што былі разасланы лісты».

У далейшых нумарох «Ч. П.» заводзіць аддзел з даволі крымінальнаю назваю—«цэпам па галаве" — у якім б'е ўсякіх злачынцаў, да якіх яшчэ суд не дабраўся. Дык вось у гэтым аддзеле варта было-б адвесьці гапаровае месца для некаторых праўшчыкаў і карэктароў газэты «Ч. П.». У тымжа нумары зьмешчаны фэльетон «Накладная № 52907», дзе нейкі В. Золкі робіць дарэмныя патугі выціснуць з сябе хоць кроплю гумару; гэты В. Золкі для большага, мабыць, гумару слова «багаж» замяняе словам «цяжар», а фэльетон заканчвае так: **„Ці штурхаў там чорт на ст. Гарочычы якогась агэнта, мы ня ведаем, а пры тое ён быў «на вяселі ня сумляваемся»*) «Не сумляваемся» і мы, што аўтар мае вельмі малы «цяжар» асабліва ў галіне некаторых граматычных правілаў, дый наогул беларускай мовы. Наогул, мова „Ч. П." не пакідае жадаць нічога лепшага!**

„Я ГУБІЎСЯ Ў ЗАГАДКАХ, адказ-жа зусім просты...

„Партрэты і плякаты некаторыя абарваны, а АСТАТНІЯ МАЮЦЬ СУМНЫ ВЫГЛЯД...

„52 ні БУДОЎЧАГА ЛЕСУ.

„Неабходнасьць самай шырокай, самай НЯУСТАННАЙ)**

„ТАКОВЫ тыя заветы, ВЫПАЎНЯЯ ЯКІЯ, можна знайці сапраўдныя сацыялістычныя шляхі і абнаўлёнай вёсцы.

„Чэрчыць ВЫТВАРАЕ агляд танкаў.

Супрацоўнікі «Ч. П.» столькі навытваралі шэдэўраў сваёй няпісьменнасьці ды пячуласьці, што няма магчымасьці пералічыць іх. Хаця-б і ў прыведзеных прыкладах апошнія тры зьяўляюцца літаральнымі перакладамі расейскіх сказаў. Лепш было падумаць ды перакласьці расейскі сказ жывым беларускім сказам, які быў-бы зразумелым для селяніна! Такі адказнейшы матар'ял, як перадавы артыкул у ленінскім нумары—і той не абыходзіцца бяз дзікіх ляпсусаў.

„Ня было дня... калі б ня ня ІСХОДЗІЛА з заветаў..

ТАК ЯК УСЕ ГЭТЫЯ ПОСЬПЕХІ ВЕЛЬМІ ВЯЛІКІ,...

„Перабудаваць дробныя гаспадарні ў буйныя калектыў...

Адгэтуль ня так далёка ўжо і да сурёзных ляпсусаў. Супрацоўнікі, перакладаючы расейскія сказы і лёзунгі на малавядомую ім беларускую мову, падаюць ім некалькі інакшы сэнс.

„Шэраг асоб, якія далучаюцца к ВЫКЛЮЧНЫМ на 15 зьезьдзе УсеКПБ...

Скарачэньні часоў ваеннага камунізму, гэта нявычарпаная крыніца для многіх гумарыстаў нашага часу знаходзіць сабе ўжытак і часам даволі арыгінальны. Лень супрацоўніку правесьці лішні раз пяром, і зьяўляюцца гэткія дыямэнты мовы:

Вэтурач	Працыалкітыў
Дзяржгандльбел	Насьценкор.
Каўэскадрон	і г. д.
Культпраца	

Ня кожны і прачытае!..

Мы ня будзем спыняцца на карэктурных і арфаграфічных памылках, іх ня пералічыш. Ня пералічыш таксама і словаў, якія ня маюць нічога супольнага з жывою беларускаю моваю і зьяўляюцца прадуктам канцэлярска-бюракратычнага падыходу да справы і нізкай пісьменнасьці супрацоўнікаў. Сюды трэба аднесьці і нясталасьць у тэрміналёгіі: напрыклад, у аднэй і тэй-жа заметцы ўжываецца і «заём» і «пазыка», у другой заметцы „скаціна" і «жывёла»; «общество» перакладаецца «грамадзянства». Нельга пералічыць і неўласьцівыя беларускай мове звароты.

Адводзіць газэта месца і літаратурнай творчасьці. Што гэта за творчасьць, можна ўявіць сабе з невялічкай заметкі «У літаратурным кошыку». Аўтар заметкі піша:

„За апошнія месяцы атрымана 225 вершаў і 16 апавяданьняў... Увесь гэты матэрыял важыць каля 5-ці фунтаў".

Трэба думаць, што ў гэтыя 5 фунтаў не залічаны тыя вершы, якія ў гэтым-жа нумары надрукованы, бо наўрад ці можна іх лічыць па якасьці лепшымі за тыя, што засталіся ў кошыку. Вось прыклад:

Краіна, родная краіна!
Краіна, дзікіх траў і хмызьняка,
Над табою пла ала асіна
І цяпер усё плача асака...
Скрозь балота, дзебры і курганы,
Гушчары, над возерам даза
І нераз на гэтыя палины
Праліваеся горкая сьляза...

Гэта цэлы верш, рэшта такія самыя, убогія па форме і па зьместу лірычныя рыфмаваныя непаразуменьні. Апавяданьне, зьмешчанае ў нумары, нічым ня лепш за вершы.

Нельга спасылацца на карэктурныя памылкі—у нас заўсёды карэктар прымае на сваю галаву няпісьменнасьць супрацоўнікаў. Супрацоўнік сялянскай газэты, выходзячы на беларускай мове, павінен **ведаць і ўжываць жывую беларускую мову**, а не абмяжоўваецца пераніцоўваньнем канцэлярскіх зваротаў. Часта даводзіцца чуць скаргі на беларускую літаратуру—цяжка зразумець і г. д. У гэтым вінна не беларуская мова, у гэтым вінны тыя, хто сьвядома ці несьвядома яе калечыць і замяняе яе нейкім дзікім жаргонам. Нам трэба асабліва завастрыць увагу на пытаньнях удасканаленьня, ачышчэньня і ажыўленьня мовы, якая ў нашых абставінах зьяўляецца перашкодным фактарам у справе культурнай рэвалюцыі. Час ужо пачаць з нашага лексікону ўсякія «небдраны», «земляздрыгі», ды ўсю іх радню. Культура дзелавой мовы, культура мовы газэтнай—гэта, побач з культурай мовы мастацкай літаратуры, адно з важнейшых заданьняў сёлешняга дню.

Т. Г-кі.

*) Орфографія ўсюды на «Ч. П.»

**) Як на вёсцы кажуць: «каб ты ня ўстаў» Т. Г.

Ад сельскага суда нельга чакаць толку.

Я лічу, што высунутыя меркаваньні тав. В. абгрунтаваны выключна на адным аргуманце—на павялічэньні ліку зямельных спраў у земкамісіях, і вось гэта павялічэньне шукае выхаду дзеля разгрузкі. Як выхад, тав. В. раіць утварэньне сельскага зямельнага суду, на які марыць усклясьці разгляд, апроч звычайных спраў, нават і падзел гаспадарак. Па мойму асабістаму перакананьню, тав. В. знайшоў ня зусім здатны выхад у справе набліжэньня зямельнага суду да сялянства. Па яго праэкту створыцца больш непатрэбнай блытаніны ў разьвязваньні зямельных і маемасных спрэчак.

Кажучы аб новай судовай ячэйцы сельсавецкай, мы павінны зьвярнуцца да існуючага раённага зямельнага суду і паглядзець—як ён працуе, ці забясьпечан ён добрым складам працаўнікоў і якія недарэчнасьці ёсьць у яго працы.

Старшыні зямельных камісій у большасьці сваёй зьяўляюцца малападрыхтаванымі для судовай працы і падчас мала ўлучаюць ёй увагі, бо яны ацяжараны справамі зямельнай часткі, лічачы іх сваім асноўным абавязкам. Да разгляду судовых спраў яны падыходзяць паказённаму, што выклікае скасаваньне іхных прысудаў (

З сёньнешнім нумаром нашай газэты рассылаецца дарэмна

Літаратурны дадатак.

Хроніка.

Усебеларускі зьезд працаўнікоў друку.

Усебеларускі зьезд працаўнікоў друку адбудзецца 12-га лютага. На зьезьдзе будуць заслуханы даклад аб бліжэйшых задачах друку і даклад камітэту на справах друку. Апроч гэтага, будуць заслуханы—даклад Цэнтральнага Савету і справаздача ЦБ сэкцыі працаўнікоў друку.

Нарада загадчыкаў савпартшкол.

АПА ЦК КП(б)Б і Нар. Кам. Асьветы склікаюць на 24-га лютага нараду загадчыкаў савпартшкол.

На гэтай нарадзе будзе абгаворана становішча і прада савпартшкол, мэтады і вынік працы ў савпартшколах. Нарада працягнецца некалькі дзён.

Справаздача Белдзяржстраху на ўсесаюзнай нарадзе па страхаваньні.

15 сакавіка ў Маскве склікаецца Ўсесаюзная нарада па с.-г. страхаваньні. На гэтай нарадзе будзе заслухана справаздача Белдзяржстраху аб становішчы с.-г. страхаваньня ў БССР. Ад Беларусі на нараду камандыруецца 3 дэлегаты.

Усебеларуская перарэгістрацыя сяброў т-ва «Прэч Няпісьменнасьць».

Прэзыдыум цэнтральнага савету т-ва „Прэч няпісьменнасьць" пастанавіў правесьці ўсебеларускую перарэгістрацыю сяброў т-ва.

Мэта перарэгістрацыі—выявіць колькасьць сяброў т-ва па БССР, пашырэньне сеткі ячэек і ўцягненьне новых сяброў у т-ва „Прэч няпісьменнасьць". Перарэгістрацыя павінна быць скончана 1-га сакавіка.

Таныя абеды для беспрацоўных.

Біржа Працы штодзённа выдае беспрацоўным каля 600 льготных абедаў. Гэтыя абеды абходзяцца беспрацоўным у 15 кап.

6.169 студэнтаў атрымліваюць дзяржаўную стыпэндыю.

У бягучым навучальным годзе у ВУЗ'ах, тэхнікумах і рабфаках БССР атрымліваюць стыпэндыю 6.169 студэнтаў, ці 47 пр. усяго студэнцтва БССР.

Сяляне на курорты.

За курортны сэзон 1927 году з БССР было паслана на курорты па сродкі Нар. Кам. Аховы Здароўя 116 сялян. Большасьць сялян было накіравана ў Лівадыйскую санаторыю (б. царскія палацы). У папярэднім курортным сэзоне было паслана з БССР на курорты 90 сялян.

43.000 руб. на агнятрывалае будаўніцтва.

Прымаючы пад увагу важнасьць разьвіцьця агнятрывалага будаўніцтва ў сельскіх мясцовасьцях, аддзел сельскай гаспадаркі Нар. Кам. Земляробства пастанавіў, каб дзяржаўныя племянныя гаспадаркі ў большасьці перайшлі на агнятрывалае будаўніцтва. На гэту патрэбу маркуецца адпусьціць 43.000 руб.

Пашырэньне тэлефоннай сеткі.

З 20 лістапада да апошняга часу ўключана ў тэлефонную сетку г. Менску 250 новых абанэнтаў. Зараз ужо абслугоўваецца тэлефонам 1212 абанэнтаў; да мая сетка будзе пашырана да 1400 абанэнтаў, г. зн. да такой колькасьці, якую можа абслужыць новая тэлефонная станцыя пры сучасных умовах.

Племянны гадавальнік пташніцтва.

Дзеля разьвіцьця і палепшаньня пташніцтва ў сяланскіх гаспадарках, а разам з гэтым пашырэньня экспорту прадуктаў пташніцтва, Нар. Кам. Земляробства БССР арганізуе дзяржаўны племянны пташнік, у якім будуць разводзіцца палепшаныя гатункі пташак. Апошні арганізуецца ў племянной гаспадарцы „Сеньніца", Менскай акругі.

У цішы бібліатэк.

Жыцьлёвыя ўмовы нашага савецкага вузаўца ці рабочага яшчэ, зразумела, далёкі ад нармальных. У большасьці—маленькі пакойчык, у якім бывае то вельмі горача, бо тут-жа гатуецца абед, то вельмі холадна.

У такім пакойчыку зьмяшчаецца часта сямейны.

Дзе тут думаць пра вучобу, дзе тут знайсьці вольную хвіліну, каб пачытаць якую-небудзь кніжку ці палумаць над якім-небудзь цікавым працоўнага пытаньнем?

— Антось, накалі дроў! Антось, прынясі вады!—выкрыквае яго палавіна.

А хлапчук, пяцігадовы Пятрусь, прыстае расказаць яму якую-небудзь казку, а яшчэ меншы крычыць на ўсё горла ў сваёй калысцы.

І Антось коле дровы, носіць ваду, расказвае цікавую казку пяцігадоваму Пятрусю, гойдаючы ў той-жа час у калысцы маленькага Алёшу.

Не да кніг тут і не да вучобы!

І было-б зусім дрэнна, каб ня было бібліятэк з іх цішынёй, з іх заклікаючай да вучобы абстаноўкай.

Сюды ад шуму і гулу заводаў, фабрык і ўстаноў, ад бесталковых часта сходаў, ад занадта цеснага сямейнага ачагу зьбіраюцца з розных канцоў гораду ўсе тыя, хто прагне ведаў, хто прагне сьвету, хто хоча вучыцца. І тут яны знаходзяць тое, чаго дарма шукалі ў іншым месцы—спакой і кнігі.

* * *

Цішыня. Тут так ціха, што чуеш муху, якая пражужыць дзе-небудзь у кутку.

Вялікая заля беларускай дзяржаўнай публічнай бібліятэкі з высокімі вокнамі здавалася-б пустою, каб ня сотня чалавечых галоў, нахіленых над раскрытымі кнігамі. І хто толькі тут не перабывае за дзень! Тут і вузавец над формуламі, тут і служачы савецкае ўстановы, які цікавіцца гісторыяй ці палітэканоміяй, тут і рабочы са шклянога заводу ці з суседняй пабудоўкі: праз чытаньне яны хочуць папоўніць свае веды, у кнізе хочуць знайсьці адказ на хвалюючыя пытаньні.

Многа іншага ўсякага народу прапускае бібліятэка: больш тысячы чалавек у дзень.

— Што вы чытаеце, таварыш?—пытаюся ў аднаго рабочага-будаўніка.

Падымае галаву і, усьміхаючыся, адказвае:

— Ды вось на апошнім адчыненьні партсходзе чуў я, як гаварылі пра рэвалюцыю 48 году ў Францыі і называлі яе лютаўскай. Я і прышоў сюды, каб пачытаць, што гэта за рэвалюцыя такая.

— Ну, і што-ж?

— Дасюль я думаю, што была толькі адна француская рэвалюцыя, а зараз бачу, што рабочая клясa ва ўсім сьвеце вяла і вядзе нясупынную і крывавую барацьбу за сваё вызваленьне...

А чорныя і суровыя полкі, што выстраіліся ўздоўж сьцен, сур'ёзна глядзяць шматтысячнымі томамі на сваіх працоўных вучняў, якія прышлі ў гэту скарбніцу чалавечых ведаў вучыцца, вучыцца і яшчэ вучыцца.

Н. Б.

Рознае.

ГАНДЛЯРЫ «ЖЫВЫМ ТАВАРАМ".

У Буэнос-Айрэсе (Амэрыка) арыштавалі 10 гандляроў „жывым таварам", якія ўваходзяць у вялікую міжнародную арганізацыю па гандлю жанчынамі. Некаторыя з арыштаваных належаць да вышэйшых колаў буржуазеі.

ВЫРАБЫ З САЛОМЫ.

Амэрыканскія вучоныя знайшлі спосаб карыстаць салому на розныя вырабы. Гэтыя вучоныя даводзяць, што з кілёграма саломы можна зрабіць розных рэчаў на суму да 75 капеек. З саломы ў Амэрыцы вырабляюць паперу, тканіну, пэглу, падушку і іншыя рэчы, якіх налічваецца да 200.

АЎТАМАТЫЧНАЕ ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ АБ ЗЕМЛЯТРАСЕНЬНІ.

Ангельскі вучоны Эванс надумаў спэцыяльныя аўтаматычныя званкі, якія папераджаюць за некалькі гадзін аб набліжэньні землятрасеньня.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулу 193 Крымінальнага Кодэксу БССР.

На падставе артыкулу 2 пастановы III сэсіі ЦВК БССР IY скліканьня за 26 ліпеня 1923 году „Аб парадку ўнясеньня зьмен у кодэксы, зацьверджаныя ЦВК Беларусі" (З. З. БССР 1923 г., № 13-14, арт. 115) і пастановы ПВК і СНК СССР за 17 жніўня 1927 году „Аб квотніцтве" (З. З. СССР 1927 г., № 48, арт. 490) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць артыкул 193 Крымінальнага Кодэксу БССР у наступнай рэдакцыі:

„193. Браньне процантаў за пазычкі звыш разьмеру, устаноўленага для данае мясцовасьці Саветам Народных Камісараў БССР, а таксама браньне за пазычаныя прылады вырабу, жывёлу, палёвае ці агароднае насеньне платы, якая значна перавышае звычайную для данае мясцовасьці норму (квотніцтва), выклікае—

пазбаўленьне волі бяз строгае ізаляцыі на тэрмін да аднаго году.

Калі-ж гэта зроблена як промысел альбо са скарыстаньнем цяжкага матар'яльнага становішча другое стараны (кваліфікаванае квотніцтва)—

пазбаўленьне волі бяз строгае ізаляцыі на тэрмін да трох год".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяконў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР Н. Галадзед.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

19 студзеня 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении статьи 193 Уголовного Кодекса БССР.

На основании статьи 2 постановления III сессии ЦИК БССР IY созыва от 26 июля 1923 года «О порядке внесения изменений в кодексы, утвержденные ЦИК Белоруссии» (С. У. БССР 1923 г., № 13-14, ст. 115) и постановления ЦИК и СНК СССР от 17 августа 1927 года „О ростовщичестве" (С. З. СССР 1927 года, № 48, ст. 490) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изложить статью 193 Уголовного Кодекса БССР в следующей редакции:

„193. Взимание процентов по займу сверх размера, установленного для данной местности Советом Народных Комиссаров БССР, а также взимание за предоставленные в пользование или в виде ссуды орудия производства, скот, полевые или огородные семена платы, значительно превышающей обычную для данной местности норму (ростовщичество), влечет—

лишение свободы без строгой изоляции на срок до одного года.

Если же эти деяния совершены в виде промысла или с использованием тяжелого материального положения другой стороны (квалифицированное ростовщичество)—

лишение свободы без строгой изоляции на срок до трех лет".

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

19 января 1928 г.
г. Минск.

Бібліаграфія.

Карысная і патрэбная кніжка.

(В помощь партучебе. Сборник материалов. Издание Агитпропа ЦК КП(б)Б).

У прамове да гэтае кніжкі напісана, што яна выдадзена для кастрычнікавага прызыву. Мы знаходзім, што яе з вельмі вялікім посьпехам для сябе выкарыстае любы дакладчык, любы таварыш, які займаецца самаадукацыяй.

Асаблівасьць кніжкі—гэта сыстэма яе складаньня. Побач з матар'ялямі агульна-саюзнага характару, агульна-партыйнага падаецца матар'ял беларускі, з жыцьця БССР і КП(б)Б. Побач з матар'ялямі аб будаўніцтве і росьце БССР, падаюцца матар'ялы аб БССР, аб яе прамысловасьці, сельскай гаспадарцы, культуры.

Чытач тут знаходзіць усе матар'ялы, якія яму патрэбны, каб уявіць сабе становішча СССР і БССР, і ў гэтым галоўная асаблівасьць кніжкі, бо да гэтага часу ў партвучобе нам прыходзілася карыстацца матар'ялямі толькі агульна-саюзнага характару. Колькі гэта разоў скардзіліся кіраўнікі партгруп, партшкол, палітшкол на тое, што як хочаш вучобу пабудаваць на мясцовым вопыту і практыцы, прыходзіцца цэлымі тыднямі шукаць належнага матар'ялу. Зараз гэты голад у пэўнай меры задавальняецца.

Кніжка складаецца з 5 разьдзелаў: „10 лет борьбы и строительства", „разногласия с оппозицией", „партийная дисциплина и троцкистская оппозиция 1926-27 г.г", „практическое разрешение национального вопроса в Белоруссии" і апошні „устав ВКП(б)". Кожны разьдзел будуецца па прыкладу падачы раней матар'ялу агульна-саюзнага, а пасьля мясцовага матар'ялу ў выглядзе вытрымак з прамоў т. Кнорына на XI зьезьдзе КП(б)Б, пастаноў зьезду, пленуму ЦК КП(б)Б і інш.

Матар'ялы пададзены сьціпла, ясна і канкрэтна. Асобнымі адрыўкамі пададзен матар'ял аб анэксіі, які лёгка дае магчымасьць кожнаму, нават мала разьвітому партыйцу ўявіць сабе ўвесь ход барацьбы в анэксіцыяй і сэнс разгалосьсяў. Ня варта шмат даказваць, што ў гэтым матар'яле зараз адчуваецца вялікая патрэба, і кніжка знойдзе свайго чытача.

Асобна стаіць разьдзел аб практычным вырашэньні нацыянальнага пытаньня. На вялікі жаль сюды чамусьці ня ўставілі пункты з праграмы партыі па нацыянальнаму пытаньню і некаторыя вытрымкі з пастаноў зьезду УсеКП(б) і з прамоў і артыкулаў па гэтаму пытаньню. Адсутнасьць гэтых матар'ялаў пашкодзіць шмат каму з Кастрычнікавага прызыву ўявіць сабе, што нацыянальнае пытаньне на Беларусі—гэта не надуманая роч, ня ўступка дробна-буржуазным элементам, а што яна выклікана ўсёй гісторыяй 30-гадовай барацьбы партыі, а таксама і партыйнай праграмы. Трэба было хоць-бы на 20-30 радкоў уставіць пункт аб сутнасьці нацпытаньня наогул, аб агульнай палітыцы УсеКП(б) у гэтым пытаньні.

Гэты разьдзел вельмі багаты вытрымкамі і пастановамі, што стварае суцэльнае ўражаньне аб паступовым разьвіцьці нацыянальнай палітыкі КП(б)Б. Сутнасьць нацпытаньня ў Беларусі, культурнае адраджэньне Беларусі, лінія КП(б) у працы сярод яўрэяў, палякаў, жыхароў, асноўныя вынікі нацпалітыкі і ў прыватнасьці беларусізацыі, моманты нацпалітыкі ўнутры партыі, міжнацыянальныя адносіны, вялікарасейскі і беларускі шавінізм, яўрэйская і польская нацыянальная абмежаванасьць, барацьба з перажыткамі русіфікацыі і перашкоды беларусізацыі, рост і рэгуляваньне складу КП(б)Б,—усе гэтыя пытаньні высьвятляюцца ў кніжцы, і трэба сказаць, што ўкладчык не са ўсёй масы матар'ялаў, якія былі ў яго распараджэньні, якраз узяў тое, што трэба.

Агульнае ўражаньне ад кніжкі добрае. Выдадзена яна надрэнна.

Н. З.

Папраўка.

У № 23 „Савецкай Беларусі" ад 27 студзеня была надрукавана „Рэзалюцыя Савету Нацыянальнасьцей ЦВК Саюзу ССР, якая прынята па дакладу тав. Хацкевіча аб правядзеньні беларусізацыі ў БССР". 4 пункт рэзалюцыі надрукаван у памылковай рэдакцыі. Павінна быць:

„4. Надаюцы асабліва важнае значэньне забесьпячэньню працоўных усіх нацыянальнасьцей БССР літаратурай і падручнікамі на роднай мове, лічыць неабходным пашырэньне выдавецкае справы ў БССР, для чаго паставіць пытаньне аб дадатковых асыгнаваньнях на беларускае выдавецтва як з рэспубліканскіх, гэтак і агульна-саюзных сродкаў".

Дом Асьветы.

ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СЯБРОЎ ДОМУ І САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Сёньня, 29 студзеня—выступленьне эстрадных артыстаў Мішэль-Эліна, Кальчэўскай і Сярожы Бузацёра.

У праграме: маніпуляцыя, мнемотэхніка, «чревовещание», дрэсыраваныя сабакі і інш. нумары.

Пачатак роўна а 1 з пал. гадз. дню. Білеты па 10 кап.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

на ЛЮТЫ **ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА** на ЛЮТЫ

на самую папулярную распаўсюджаную беларускую

ГАЗЭТУ **„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"** ГАЗЭТУ

ОРГАН Ц. В. К. Б. С. С. Р.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц . . . . . — 90 кап. | На 3 м-цы . . . . . 2 р. 70 кап.
„ 2 м-цы . . . . . 1 р. 80 кап. | „ 6 м-цаў . . . . . 4 р. — кап.
На год . . . . . 8 руб. — к.

Пачынаючы з лютага, пры газэце пачне выходзіць два разы ў месяц

ЛІТАРАТУРНЫ ДАДАТАК,

ЯКІ БУДЗЕ РАССЫЛАЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ БЯСПЛАТНА.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты рог вуліц Ленінскай і К. Маркса, у правінцыі—упаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

КНІГА

„ЗАПАДНАЯ БЕЛОРУССИЯ"

(на расейскай мове)

ВЫШЛА З ДРУКУ

і прадаецца ў кнігарнях БДВ.

Каштоўныя рэдкія матар'ялы, неабходныя кожнаму, каго цікавіць лёс Заходняй Беларусі.

Старонак 210. Цана 1 руб. 50 кап.

ШУКАЮ

добрага настаўніка

ФРАНЦУСКАЕ МОВЫ.

Зьвярнуцца ў рэдакцыю.

Гр-ка ГУЗ Караліна Іосіфаўна, якая паходзіць з гр-н г. Баранавіч і жыве ў г. Барысаве,—нараджэньня 1908 г.—зьмяняе прозьвішча ГУЗ на прозьвішча „КАСЬПЯРОВІЧ".

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, просяць паведаміць аб гэтым у Менскі ЗАГС, паказаўшы сваё імя, прозьвішча і месца жыцьця.

ПРАДАЕЦЦА ЗРЫЎ-ПАПЕРА І СТАРЫЯ ГАЗЭТЫ.

ДАВЕДАЦЦА Ў КАНТОРЫ ГАЗ. «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» (РОГ ВУЛІЦ — КАРЛА МАРКСА І ЛЕНІНСКАЙ).

Народны Камісарыят Гандлю БССР

гэтым даводзіць да ўсеагульнага ведама, што 25 студзеня 1928 г. ім занесен у другі разьдзел гандлёвага рэестру СССР (па БССР) пад № 22 трэст пад назваю

„Гандлёва-Будаўнічы Трэст Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту",

скарочаная назва **„ТОРГСТРОЙ".**

Эканамічная Нарада пры СНК БССР зацьвердзіла статут памянёнага трэсту 1-га жніўня 1927 г. пратаколам № 23, п. XIII.

Кіраўніцтва Трэсту ў асобе дырэктара—у г. Менску. Прадмет прадпрыёмства—аб'яднаньне кіраўніцтва гандлёва-будаўнічымі прадпрыёмствамі Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту.

Ніжэй абвяшчаецца ўступны баланс трэсту на 1 мая 1926 г. на суму актыву 1.415.122 р. 78 к., зацьверджаны сталай камісіяй пры Менакрфа па разгляду і зацьверджаньні балянсаў і прэзыдыумам Менакрвыканкому.

Сэкратар Наркамгандлю БССР МАЗО.

ВСТУПИТЕЛЬНЫЙ БАЛАНС

Торгово-Строительного Треста Минокрисполкома „ТОРГСТРОЙ"

АКТИВ. НА 1-ое МАЯ 1926 ГОДА. ПАССИВ.

№№ п/п.		Частная	Общая	Проц. отнош.
1	**Имущество:**			
	Здания и сооружения	161.033-14		
	Машины и технич. оборуд.	83.564-48		
	Инструменты	12.715-11		
	Инвентарь	30.125-74		
	Запасное оборуд.	360-86	287.799-33	20,3
2	**Материалы:**			
	Основные	68.717-81		
	Топливо	6.824-25		
	Вспомогательные	20.550-17		
	Разные	15.866-61		
	В пути	214-00	112.172-84	7,9
3	**Товары и фабрикаты**			
	В магазинах и складах	214.865-33		
	На хранении	75-58		
	Комиссионные	45-50		
	В пути	1013-00	215.999-41	15,3
4	**Незаконченное производство.**		305.983-80	21,6
5	**Денежные средства**			
	Касса	8.661-16		
	Тек. счета	22.996-55	31.657-71	2,3
6	**Ценные бумаги:**			
	В наличии	1.552-00		
	В залоге	30.369-37	31.921-37	2,2
7	**Дебиторы:**			
	Покупатели	18.739-89		
	Работодат.-заказч.	137.535-11		
	Разные лица и учрежд.	61.650-75		
	Рабочие и служащие	8.524-92		
	Подотчетные лица	799-56		
	Поставщики (авансы)	103.662-45	330.912-68	23,4
8	**Сомнительные долги**		30.941-39	2,2
9	**Безнадежные долги**		2-00	
10	**Обязательства и документы к получению**			
	Векселя в портфеле	17.296-40		
	„ в учете	36.681-65		
	„ протестов.	70-00		
	Документы на инкассо	11.764-98		
	Наложен. платеж.	869-73	66.709-76	4,7
11	**Переходящие суммы**		147-37	
12	**Расходы будущего периода.**		875-12	0,1
	БАЛАНС	—	1.415.122-78	100

№№ п/п.		Частная	Общая	Проц. отнош.
1	**Уставный капитал:**			
	Основной	287.799-33		
	Оборотный	163.250-49	451.049-82	31,9
2	**Резервный капитал**	7.049-35	7.049-35	
3	**Фонды:**			
	Улучш. быта рабоч. и служащих	14.613-51		
	Специальн. промышл.	9.692-75		
	Сомнительн. долги	30.941-39		
	На покрытие убытков по незакончен. рем. раб.	4.284-06	59.531-71	4,2
4	**Ссуды и займы:**			
	Спец. тек. счета	18.130-09		
	Банки по учету векселей	36.681-65		
	Ссуды Минокрика	154.000-00	208.811-74	14,8
5	**Кредиторы:**			
	Поставщики	7.338-74		
	Разн. лица и учрежд.	334.781-56		
	Комитенты	45-50		
	Рабочие и служащие	9.115-36		
	Покупатели (авансы)	90.100-63		
	Работодатели-заказч. (авансы)	73.718-90	516.100-69	36,9
6	**Векселя выданные**		173.579-47	12,3
	БАЛАНС	—	1.415.122-78	100

Управляющий трестом МАКАРЕВИЧ.

Главбух ЗАЙЦ.

Баланс рассмотрен и утвержден постоянной комиссией при Минокрфо по рассмотрению и утверждению балансов, согласно протокола от 20 марта 1927 года и к опубликованию в газете разрешается.

Председатель МИРОНОВ. Секретарь ПЕРЕГУД.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

нядзеля, 29 студзеня,

„Каля тэрасы". Народн. драма ў 4-х дзеях з час. 1917 году.

ПАЧАТАК А 8 З ПАЛ. ГАДЗ. ВЕЧАРА.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — МАСТАЦКАЯ БЫТАВАЯ ФІЛЬМА **„УХАБЫ".** ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—ХРОНІКА САВКІНО № 110.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — 3 аўторка, 24-га студзеня—СУСЬВЕТНЫ БАЯВІК—ШЭДЭЎР КІНО-ТЭХНІКІ І МАСТАЦТВА **„ВАР'ЕТЭ".** Трагедыя ў 7-х частках. Штодня—4 сэансы. Цэны звычайныя.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — **„СУМКА ДИПКУР'ЕРА".** Драма ў 7-х частках. Пачатак сэансаў у 6, 7 з пал., 9 і 10 з пал. гадз. увечары. АНОНС! Хутка „Шостая частка сьвету".

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — ДУГЛАС ФЭРБЭНКС, МЭРЫ ПІКФОРД І ІГАР ІЛЬІНСКІ Ў ВЫДАТНАЙ ФІЛЬМЕ **„ПОЦЕЛУЙ МЭРИ".** Звыш праграмы—гастроль артыста маскоўскай і ленінградзкай эстрады Е. А. МУРАТАВА.

БІБЛІАТЭКА РАБОТНІЦЫ І СЯЛЯНКІ.

НОВЫЯ КНІГІ.

М. Наўлянскі.—Каапэрацыя і сялянка. 48 стар. Цана 20 кап.

Б. А. Грунфэст.—Што павінна ведаць раб. і сялянка аб каапэрацыі. 30 ст. Цана 13 к.

А. Сташэўскі.—Як работніца і сялянка кіруе СССР. 60 ст. Цана 20 кап.

Н. Танаевцева.—Что надо знать работнице о профсоюзах. 62 ст. Цана 23 кап.

М. Карклін.—Промышленность СССР и БССР. 58 ст. Цана 30 кап.

СКЛІКАНЬНЕ

ўсебеларускай канфэрэнцыі „Маладняка"

ПЕРАНОСІЦЦА З 6-га на 15-га ЛЮТАГА.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ.

№ 1 ВЫШАЎ З ДРУКУ № 1

НОВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ЧАСОПІСІ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І КРЫТЫКІ

„РОСКВІТ"

ОРГАН ЛЕВАГА ФРОНТУ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ.

ВЫДАНЬНЕ Беларускае Літаратурна-Мастацкае Камуны.

У ПЕРШЫМ НУМАРЫ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ:

ПАЭЗІЯ:

Ул. Прыбыткоўскі, Янка Відук, Апанас Атава, Зося Палыя, Рыгор Казак, Пятрусь Броўка, Паўлюк Шукайла і інш.

ПРОЗА:

Алесь Гародня—«Варта на Рэйне», аповесьць.
Янка Відук—«Памятнае», апавяданьне.
Дзядок—«Падхалім», літаратурны фэльетон.

КРЫТЫКА:

М. Бухарын—«Аб даўніх традыцыях і сучасным культурным будаўніцтве»
Праф. М. М. Піотуховіч—«Творчасьць Цішкі Гартнага».
Паўлюк Шукайла—«Літаратурнае сёньня».

Часопісь будзе выходзіць адзін раз у два месяцы—6 нумароў у год, разьмерам 280 тыс. друкаваных знакаў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ НА 1928 ГОД.

На 1 год (6 нумароў) з дадаткам 3-х зборнікаў творчасьці сяброў Бел. Літ. Маст. Камуны	— 4 руб.
Без дадатку	— 3 »
На паўгода з дадаткам	— 2 » 20 к.
Без дадатку	— 1 » 80 »

Падпіска прымаецца: У рэдакцыі часопісі—МЕНСК, МІХАЙЛАЎСКАЯ, 7, кв. 4, ТЭЛ. 11—65, а таксама ва ўсіх кнігарнях БДВ, у кіёсках на станцыях чыгункі, ва ўсіх паштовых аддзяленьнях, кальпазікоў і лістаносцаў.

Падпісчыкам даецца магчымасьць выслаць рэдакцыі толькі 30 працентаў гадовае ільты, а рэшту грошай выплачваць часткамі пры атрыманьні кожнага нумару накладною платаю.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Справўка аб скасаваньні шлюбу Едзіновіч Е. І., выд. Барысаўск. ЗАГСам.

— Пасьведчаньне аб дапрызыўн. падрыхтоўцы Шумскага В., выд. Барысаўск. ваенкамат.

— Конская кніжка № 1817, Сманцэр А. А., выд. Барысаўскім РВК.

— Лекавая кніжка Жангарова С. М., выд. Барысаўскай страхкасай.

— Заборная кніжка № 5101, Жураўскага С., выд. Барысаўск. ЦРК.

— Сяброўская кніжка № 49349, Казака А. С., выд. Барысаўскім саюзам чыгунчнікаў.

— Чырвонаарм. кніжка Міцькіна Е., выд. 4-м Чырвонаармейск. палком.

— Лекавая кніжка Камоцкай Е. В., выд. Барысаўскай страхкасай.

— Заборная кніжка № 5100, Жолкевіч А. Ф., выд. Барысаўск. ЦРК.

— Конская карт. № 222, Невяровіча І., выд. Барысаўскім РВК.

— Вайсковая кніжка Вельшэва М. П., выд. Барысаўск. акраенкаматам 27-1 27 г.

— Пасьведчаньне № 325 Цянго А., выд. кітайскім консулам у Маскве.

— Конская карт. Бацькевіча А. А., выд. Барысаўскім РВК.

— Сямейны пашпарт Казлоўскай Л. І., выд. віцебскай акрмілі.

— Лекавая кніжка Лісоўскага А. А. выд. Менакрстрахкасай.

— Віза, выд. награнадзь. № 14, 2) на ляўнічы білет, выд. Барысаўск. саюзам ляўнічых на імя Каравая І. С.

— Вучотная кніжка, выд. Вялікалукскім ваенкаматам Пскоўскай губ., 2) праезны дакумант, выданы таксама Вялікалукскім ваенкаматам на імя Ражкоўскага В. П.

— Асабовая кніжка, Каспэрскага М. Г., выд. Зембінскім РВК.

— Мэтрычн. справка, Рабэнкага А. С., выд. Зембінск. местачковым саветам.

— Сяброўская кніжка № 696, Ваюўскага І. Д., выд. Барысаўск. саюзам сазгандльсл.

Галоўлітбел 302

1 Дзярж. друкарня.